

Пасля разлукі ☞ 3



# Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ



а. СЛАВАМІР ЯКІМЮК ☞ 8



http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 40 (2577) Год L | Беласток, 2 кастрычніка 2005 г. | Цана 2,00 зл.

# Чыквін: выратаваў СЛД

**Размова з Яўгенам ЧЫКВІНЫМ, новаабраным дэпутатам Сейма РП.**

*„Ніва”*: — Віншуем. Не стаміліся Вы сеймавай працай?

*Яўген Чыквін*: — Дзякую. Дзякую таксама маім землякам за тое, што даверылі мне і аддалі на мяне свой голас. Абяцаю, што прыкладу ўсе старанні, каб годна вас прадстаўляць у гэтым скліканні Сейма. Стартуючы ў выбарах раблю ж гэта свядома. Гэта ўжо мой пяты тэрмін. Гэта для мяне вялікі гонар, а таксама вялікая адказнасць, не толькі як прадстаўніка меншасцей, беларусаў, украінцаў, лэмкаў, якія не маюць сваіх прадстаўнікоў. Гэта вялікая адказнасць, хтосьці мусіць узяцца за гэтае заданне.

***— Дзякуючы Вашым стараннямі ўдалося прыняць законы аб меншасцях і адносінах дзяржавы да Царквы. Што яшчэ можна зрабіць для меншасцей?***

— Зразумела, станаўленне закону — найважнейшае. У прынцыпе не ўдалося аформіць аднае праблемы, якая не датычыць жыхароў Беласточчыны, толькі праваслаўных лэмкаў і ўкраінцаў, пражываючых на Навасонччыне, дзе храмы надалей не з’яўляюцца ўласнасцю Праваслаўнай царквы. Гэта выразная дысгармонія. На жаль, з гэтым праектам не ўдалося справіцца ў мінулым скліканні Сейма. Закон гэта палова. Перш за ўсё важнейшая атмасфера вакол меншасцей. Дыскусія над законам аб нацыянальных меншасцях паказала вялікія залежы недаверу, думання ў катэгорыях стэрэатыпаў, якія пануюць сярод палітычных эліт. Бывае, што меншасці ўспрымаюцца як пагроза для польскай дзяржавы. І вось такія тоны дамінавалі сярод прамінентных палітыкаў, таксама і сярод тых, якія цяпер будуць намі кіраваць. Маю, аднак, надзею, што дыскусія над згаданым законам мела ачышчаючы характар і ў стасунках з уладамі меншасці не будуць мець крыўды. Маю на ўвазе хоць бы назначанне датацый меншасцям.

***— Але як пераканаць самаўрады да карыстання прывілеямі закону аб меншасцях?***

— На практыцы я пераканаўся, што ў беларускай грамадскасці ў Польшчы да таго яшчэ час не даспеў. Мабыць, моладзь больш радыкальная і думае больш адважна. Старэйшыя больш кансерватыўныя. На ўсё гэта трэба часу. Радныя, але і мы самі павінны аб гэта задбаць.

***— Як думаеце, ці будучая кааліцыя Права і справядлівасці ды Грамадзянскай платформы (PiS-PO) не паўплывае на рост апасак, аб якіх Вы ўспаміналі?***

— Магчыма. Веру, аднак, што ў Польшчы шмат кардынальных праблем, напрыклад, беспрацоўе, убоства, і не ўяўляю сабе, каб палітыкі цэнтральнага ўзроўню маглі даваць прычыны, якія знеахвочвалі б меншасці. Можа, не будзе якіхсьці новых жэстаў, але не прагназірую жэстаў непрыязных, з якімі мы мелі дачыненне пры АВС, калі адбіраліся датацыі, якія назначыў папярэдні прэм’ер (Цімашэвіч). Як дэпутат наступнага склікання бачу сваю ролю таксама як абаронца майго асяроддзя. Незалежна ад сітуацыі, буду пачынаць ініцыятывы, асабліва перад самаўрадавымі выбарамі, па яднанню беларускага асяроддзя, каб адпаведна да нашых аспірацый, імкненняў гарантаваць адпаведнае прадстаўніцтва ў Ваяводскім самаўрадавым сейміку. У выпадку кансалідацыі беларусы ў нашым сейміку могуць мець чатырох, а нават і пяцёх прадстаўнікоў!

***— Дзякую за размову.***

**Размаўляў Мацей ХАЛАДОЎСКІ**



Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК



Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

*Выбарчы краявід*

## Не паверылі ☞ 2

Яўген ВАПА

*У Падляшскім ваяводстве у тых гмінах, дзе пражывае нашая меншасць, яўка на выбарчых участках была самая нізкая. Вось некалькі прыкладаў: гміна Нарва — 24,21%, Нараўка — 24,88%, Нурэц-Станцыя — 25,31%, Гарадок — 27,72%, Орля —28%. Справа яшчэ не толькі ў тым, што наш вясковы выбаршчык моцна расчараваўся ў сваіх папярэдніх кумірах...*

## Моладзь ☞ 2

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

*У маім улюбёным Гродне зараз няма згуртаваных беларускіх суполак. Адзінкавыя актывісты цягнуцца да старэйшых. Як падаецца, сітуацыя ў Мінску, ці Лідзе, ці на Беласточчыне, куды лепшая. Там беларускі моладзевы рух, калі не віруе, то хоць жыве...*

## У Крыўцы ☞ 4

Аляксей МАРОЗ

*Зараз згодна з еўрасаюзнымі патрабаваннямі трэба каля абораў збудаваць умяшчальнікі на гнаёўку з-пад свіней. Пратэстуюць супраць гэтых інвестыцыяў асобы, якія перасяліліся ў нашу вёску з гарадоў. Мясцовыя жыхары звыкліся з пахам гною...*

## „Дваранкі” ☞ 9

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

*Недзе ў палове сямідзесятых гадоў завязалі мы Кола вясковых гаспадынь. І на занятках варылі, пяклі, елі, пілі і... спявалі. Была тады з намі пані Бася з Дома культуры ў Дуброве і яна намовіла нас спяваць, заснаваць калектыў. І мы сталі збіраць песні бабуль. Па хатах збіраліся, пры нагодах спявалі...*

## Вершы С. Івановай ☞ 9



## На загад ☞ 11

Міра ЛУКША

*Васіль Петручук, член Саюза пісьменнікаў Польшчы і Беларусі, чытачам „Нівы” вядомы як наш даўні карэспандэнт. Гэты хлопец з вёскі Грабавец — чалавек вайсковай справы, ужо, вядома, у адстаўцы год да свайго юбілею васьмідзесяцігоддзя, не складвае рук, займаецца грамадскімі справамі...*

# Не паверылі ў змены



Не паверылі беларусы Польшчы ў магчымасць змяніць сітуацыю ў краіне пры дапамозе выбарчага білета. У Падляшскім ваяводстве у тых гмінах, дзе пражывае нашая меншасць, яўка на выбарчых участках была самая нізкая. Вось некалькі прыкладаў: гміна Нарва — 24,21%, Нараўка — 24,88%, Нурэц-Станцыя — 25,31%, Гарадок — 27,72%, Орля — 28%. Справа яшчэ не толькі ў тым, што наш вясковы выбаршчык моцна расчараваўся ў сваіх папярэдніх кумірах. Ён яшчэ проста больш састарэўся і ў магутнасці царкоўных званоў чакае дастойнага пераходу з зямнога жыцця ў вечнае, а не блукання па выбарчых участках. У сваіх палітычных выбарах большасць гэтак званага праваслаўнага электарату мае гарадскі характар і пастаянна ставіць крыжык пры Саюзе левых дэмакратаў і Яўгену Чыквіну. Хітрая задума лідэра спіска левых дэмакратаў ваяводы Марка Стшалінскага, каб змясціць на ім як найбольш праваслаўных і.... атрымаць больш галасоў за Чыквіна, правалілася. Чыквін набраў 14 тысяч галасоў і на тры тысячы апярэдзіў ваяводу. Генеральна, аднак, беларусы не занадта давяраюць абяцанням палітыкаў. Але не толькі яны.

У гарачы, выбарчы нядзельны вечар для звыш пяці мільёнаў жыхароў нашай краіны больш важным аказалася паглядзець змаганні польскай жаночай валейбольнай каманды за залаты медаль і першынство Еўропы, чымсьці „захапляцца” сумнымі палітыкамі ў тэлестудыі. Тых у момант самага эмацыянальнага піку парламенцкай кампаніі — апавяшчэння першых вынікаў — захацела паглядзець 3,5 мільёна. Потым з гадзіны на гадзіну гледачы адыходзілі ад тэлеэкранаў. Польскае грамадства ў відавочны спосаб генеральна паказала, што сваю самарэалізацыю хоча бачыць у бяспечнай дыстанцыі ад свету палітыкаў. І тут размова не ідзе толькі пра беспрацоўных, якіх сацыёлагі называюць грамадска адкінутымі, людзей без адукацыі, з невялікіх мясцовасцей. Не мець дачынення да якой-колечы грамадзянскай актыўнасці мае ахвоту шторaз больш людзей, якім удалося нечага дабіцца ў жыцці. І пры нагодзе не хочацца ім увогуле будаваць аніякую грамадзянскую супольнасць, якая, паводле ўсіх тэорый, з’яўляецца адным з важнейшых прызнакаў дэмакратычнага ладу. Яўка выбаршчыкаў на ўзроўні 40% у маштабе дзяржавы паказвае і на тое, што пасля 1989 г. аніводная ўлада ў сапраўднасці не хацела рэальнай, грамадзянскай і пазаўрадавай актыўнасці. Яе проста сёння няма. Стваралася затое хворая сістэма палітычнага сервілізму ў выглядзе фінансавання толькі сваіх давераных арганізацый і фондаў, абавязкова ў сталіцы. Каланіяльная правінцыя атрымала права на маўчанне.

І калі ў мінулую нядзелю (добра рыфмуецца са словам надзея) слухаў я размову з уступаючым прэзідэнтам Квасneўскім і бачыў ягоную заклапочанасць нізкай прысутнасцю выбаршчыкаў, то проста хацелася ўскрыкнуць: досыць! Ці ж гэта не з-за ягонай бяздзейнасці, палітычнай крывадушнасці, нестрымання слова наконт датэрміновых выбараў не адбіраў і ён цягам сваіх дзвюх прэзідэнцкіх тэрмінаў надзеі ў людзей на разуменне палітыкі як дыялогу паміж уладамі і грамадзянамі. Сваімі дзеяннямі даваў ён прыклад палітычным авантурыстам, што ім усё можна, што яны па-над законам. Не абавязвала Кваснеўскага, як першага грамадзяніна краіны, неабходнасць даваць паказанні перад сеймавай камісіяй. Ягоным следам захацеў пайсці і маршалак Сейма Уладзімеж Цімашэвіч, але адарваны ад рэчаіснасці, на палітычных салонах не заўважыў, што іхняе разуменне палітыкі — неўспрымальнае грамадствам. Некалькі гадоў таму такую сітуацыю на правым баку палітычнай сцэны адзін з братоў Качынскіх вобразна назваў: „цяпер к...а мы” (слыннае ТКМ). Ці прыйшоўшы да ўлады браты-блізнюкі, якія як юныя акцёры праславіліся ў кінафільме „Пра двух такіх, што ўкралі месяц”, не расслабяцца і не захочацца ім здзейсніць мару з часоў дзяцінства? Спадзяюся, што не, бо хто тады праз чатыры гады пойдзе яшчэ на выбары? Відаць, тады людзі выберуць кіно і мульцікі Уольта Дыснея пра качанят.

**Яўген Вапа**

# „Прабітая” моладзь



Моладзевы рух заўжды быў істотным чыннікам грамадскага руху. Беларусь у гэтым плане не ёсць выняткам. Нацыянальнае адраджэнне 1980-х гадоў, наступствам якога стала ўсталяванне суверэннай дзяржавы, грунтавалася ці не найперш на моладзевых ініцыятывах і рухах. Варта згадаць хоць бы вальныя соймы беларускіх моладзевых суполак. А колькі тады паўстала моладзевых ініцыятыў — выдавецкіх, экалагічных, краязнаўчых, рэлігійных. Усіх і не пералічыш.

Мінула дваццаць гадоў. Адчуваючы сябе па ўсіх прыкметах сярэднім, але досыць дасведчаным, пакаленнем, міжволі задумваешся пра пераемнасць і тых, „хто ідзе за мной”. Ці ёсць яна тая „мілая, слаўная моладзь”, пра якую пісаў вялікі пясняр зямлі беларускай? Якія яны сённяшнія хлопцы і дзяўчаты, чым жывуць і кіруюцца? У адказах самым сабе можна абмежавацца адначасна правільнай і банальнай высновай — „яны не такія як мы, яны не лепшыя і не горшыя, а проста іншыя”. Але хочацца „злавіць” і асэнсаваць крыху болей. Напэўна, не толькі мне, але і многім з тых, каму пад сорак ці крыху за сорак.

Пакаленне next — гэта тэхнагеннае пакаленне. Яно засынае ля камп’ютэра і прачынаецца пад званок мабільніка. Гэта пакаленне, для якога з дзяцінства адчынены ўсе граніцы, магчымасці вучобы і працы за мяжой. У гэтым яму можна светла пазайздросціць, бо калісьці, у гады нашага юнацтва, савецкая ідэалагічная прапаганда бясконца цвердзіла крывадушны пастулат: „Молодым у нас везде дорога”. Насамрэч, гэта была дарога ў нішто з пэўнымі сацыяльнымі гарантыямі. З гарантыямі толькі тады, калі ты маршыраваў у нагу і маўчаў. Да дваццаці васьмі гадоў можна было рабіць працоўную кар’еру і быць у камсамоле, ну а потым у кампартыі. Але тут маўчаць ужо было мала, трэба было мець асабліва гнуткі хрыбет і рухавы язык. Сёння камсамольска-кампартыйная ідэалогія актыўна адраджаецца ў змутаваным выглядзе БРСМ (Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі) — Славянскі сабор.

Так што шырокі выбар з захаваннем прыстойнасці і свайго „я” сёння ёсць толькі ў тых маладзёнаў, што хочуць вучыцца, займацца інтэлектуальнай працай і бізнесам. У астатніх дыяпазон выбару звужаны. Калі ёсць фізічны гарт — дзве дарогі. Альбо ў сілавыя дзяржаўныя структуры, альбо ў бандыты. Зразумела, што на абодвух шляхах трэба крыўдзіць людзей і жыць коштам іх працы (трэба яшчэ памеркаваць, хто з акрэсленых катэгорый гэтых людзей больш крыўдзіць!?). Ну а найбольш мэтныя і настойлівыя абіраюць спорт высокіх дасягненняў — перспектывы ў гэтай сферы значныя.

Безумоўна, на цяперашняе пакаленне ўплыў замежжа куды большы. З Заходняй Еўропы прышчапілася „афрыканізацыя” (маю на ўвазе субкультуру татуяванння і „прабівання” розных частак цела колцамі). Асабіста мне недаспадобы заходні лібералізм, які нясе свету больш разбэшчанасці, чым разняволенасці. З усходу ж трывала ўкараніліся расійскія мат, слэнг і снабізм. Напэўна ёсць у маладых беларусаў і свая адметнасць. У параўнанні з заходняй і ўсходняй, наша моладзь больш ахайная, густоўная (асабліва дзяўчаты) і, здаецца, кемлівейшая. Гутарка ідзе пра той пласт моладзі, які здольны адэкватна рэагаваць на рэчаіснасць. Ёсць і іншы слой — гэта тыя, што жывуць нейкімі біялагічнымі інстынктамі, а нармальна нават гаварыць не могуць. З гэтымі надвячоркам на вуліцах лепш не сутыкацца, бо яны сапраўды „адмарожаныя”.

Сама цяжкае для ўспрымання людзей нашага веку — сённяшнія музычныя „творы” для „прабітага пакалення” з рыфмамі кшталту „асфальт-дзесяць мегабайт”. У гэтым сэнсе рок-культура папярэднікаў для нас, „васьмідзесятнікаў”, куды бліжэй, чым поп-музыка наступнікаў.

Дзіўна, але ў маім улюбёным Гродне зараз няма згуртаваных беларускіх суполак. Адзінкавыя актывісты цягнуцца да старэйшых. Як падаецца, сітуацыя ў Мінску, ці Лідзе, ці на Беласточчыне, куды лепшая. Там беларускі моладзевы рух, калі не віруе, то хоць жыве.

Падаецца, што ў цяперашняй моладзі зашмат інфантыльнасці і замала самастойнасці ў сэнсе адказнасці перад іншымі. Ды ўсё ж верыцца, што гэтае „трэцяе пакаленне” яшчэ скажа сваё важкае грамадскае слова. І так хочацца бачыць больш дзяўчат у спадніцах, а хлопцаў без завушніцаў.

**Уладзімір Хільмановіч (Гродна)**

Вачыма еўрапейца

# Лукашэнка ў ААН



Ужо гадамі гаворыцца аб неабходнасці рэформы Арганізацыі Аб’яднаных Нацый. Памятаю, як недзе з сем гадоў таму ўспамінаў аб гэтым не ў іншым месцы, як у Беластоку Лех Валэнса. Такія заклікі траплялі і трапляюць у пустэчу. Доказам гэтаму з’яўляецца апошняя шасцідзесятая Генеральная асамблея ААН. Не было прынята ніводнае рашэнне, якое б значна змяняла гэтую арганізацыю, якая мела дбаць аб бяспеку ў свеце, вырашаць эканамічныя праблемы, звязаныя, для прыкладу, з беднасцю, голадам, цывілізацыйнымі паталогіямі. Тым часам, як паказала юбілейная асамблея, трыбуна ААН стала месцам г.зв. гаварыльні сусветных правадыроў і, што больш, дала шанц выступленням прапагандысцкага характару, якія маюць апраўдваць парушэнне правоў чалавека і іншыя недэмакратычныя практыкі. Красамоўным таго прыкладам стала выступленне прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі. Галоўныя мінскія праўрадавыя газеты, як „Беларусь сегодня”, з гонарам інфармавалі, што выступленне Аляксандра Лукашэнкі выклікала вялікі водгук. Даносілі: „Сусветныя сродкі масавай інфармацыі аддалі яму вялікую колькасць эфірнага часу і многа месца на калонках газет”. Для прыкладу прыводзілі каментарый маскоўскіх „Известий”. Наколькі я ўважліва сачыў за сусветнымі масмедыямі, усё гэта мела мала супольнага з праўдай. Аднак, як аказваецца, прапагандысцкая мэта прэзідэнта Лукашэнкі была дасягнута. Сярэдні грамадзянін Беларусі мог быць пераканаы: „З нашым прэзідэнтам лічацца ў свеце, ён адзін з сусветных завадатараў”. Увесь выступ афіцыйныя газеты ў Мінску аддрукавалі поўнасцю.

Варта тут прывесці некалькі фрагментаў, пакідаючы іх ацэнку чытачу. Аляксандр Лукашэнка ледзь не на пачатку заявіў: „Мінула 15 гадоў ад распаду маёй краіны — СССР. (...) СССР гарантаваў раўнавагу глабальнай сістэмы”. Далей пераконваў недаверкаў, напрыклад тых, хто абараняе дыскрымінаваныя, а выбраныя ў сакавіку ўлады Саюза палякаў Беларусі з Анжалікай Борыс: „У маёй краіне няма канфліктаў, разам і мірна жывуць розныя народы і нацыянальнасці, прапаведуючыя кожная сваю рэлігію і вобраз жыцця. Не ствараем праблем суседзям, не прэтэндуем на іх тэрыторыю ці на выбар шляху”. Як казаў беларускі кіраўнік, пад сцягам абароны дэмакратыі і правоў чалавека ствараюцца віртуальныя прычыны для ўмешвання ва ўнутраныя справы і ў выніку да амерыканскага дыктату. Выказаўся за вызваленне Садама Гусейна і Слабадана Мілошавіча. Каварна, быццам у кантэксце атакаў на сваю асобу і ведзеную сабою палітыку, рытарычна пытаўся: „Хто патрабуе ад моцных гэтага свету спынення атакаў на Кубу, Венесуэлу і іншыя краіны? Гэтыя дзяржавы самі акрэсляць, як ім жыць”. І амаль у канцы ледзь не пагрозліва заявіў: „Якраз мы з вамі павінны лёс планеты ўзяць у свае рукі”.

Польскі і сусветны вопыт у стасунках з Беларуссю ў сённяшнім палітычным кшталце паказвае, што на нішто здадуцца парывы прэзідэнта Лукашэнкі, які, здаецца, жадае стаць лідэрам сусветнага антыамерыканізму. Цяжка не пагадзіцца з Аляксандрам Дабравольскім, віцэ-старшынёй Аб’яднанай грамадзянскай партыі, які ў выказванні „Народнай волі” сказаў: „Драбнаваты ён для гэтага. Тым больш, што мае столькі ўнутраных праблем і праблем з суседзямі, што добра было б хаця б з імі разабрацца”.

**Мацей Халадоўскі**

*М. Красоўскі: Нашаму дырэктару Яраславу Кастыцэвічу трэба было б помнік паставіць. Ён жа на веласіпедзе ездзіў па вёсках і заахвочваў вучняў пачатковых школ паступаць у беларускі ліцэй...*

# Сустрэча пасля разлукі

**На VI З'езд выпускнікоў Агульнаадукацыйнага ліцэя з беларускай мовай навучання імя Браніслава Тарашкевіча ў Бельску-Падляшскім, які праходзіў з 23 па 25 верасня, прыехала звыш 320 чалавек. Сярод іх былі выпускнікі, якія канчалі вучобу ў белліцэі ў пасляваенны перыяд. Яны ўспаміналі цяжкія ўмовы, у якіх прыйшлося выжываць беларускай школе, якая станавілася на ногі і давала шанц адукацыі на роднай мове. Выпускнікі высока ацанілі ўзровень навукі ў ліцэі, якога вучні дабіваліся шматлікіх поспехаў на прадметных алімпіядах і конкурсах. Сабраныя заклікалі не палохацца неспрыяльнай атмасферы паланізацыйных працэсаў і працаваць у карысць беларускага грамадства.**

Перад супольнай бяседай у Прачысценскай царкве была адслужана літургія, у час якой маліліся ўдзельнікі з'езда. Выпускнікі, якія ўваходзілі ў спартыўную залу Бельскага белліцэя, дзе адбывалася афіцыйная сустрэча, з радасцю глядзелі на бел-чырвона-белыя сцягі, якія нагадвалі вартасці дарагія патрону школы Браніславу Тарашкевічу. Пасля прывітання гасцей, сярод якіх былі епіскап Гайнаўскі Міран, епіскап Бельскі Грыгорый, і выпускнікоў, старшыня арганізацыйнага камітэта намеснік бельскага старасты Пётр Божка запрапанаваў ушанаваць хвілінай цішыні памерлых дырэктараў, настаўнікаў і вучняў Бельскага белліцэя. Падзякаваў ён педагогам, якія працавалі ў белліцэі ў мінулым і займаюцца з вучнямі зараз, за іх вялікую ангажаванасць у карысць адукацыі мясцовага насельніцтва.

Епіскап Бельскі Грыгорый зачытаў на беларускай мове ліст ад мітрапаліта Варшаўскага і ўсяе Польшчы Савы. Мітрапаліт дзякаваў за адукацыйную працу і дзейнасць для дабра праваслаўнага грамадства. Перад сабранымі выступілі прадстаўнікі мясцовых самаўрадаў, якія станоўча ацанілі дзейнасць школы. Дырэктар белліцэя Андрэй Сцепанюк і некалькі настаўнікаў атрымалі з рук старасты Бельскага павета Славаміра Снарскага ўзнагароды. Дырэктар Андрэй Сцепанюк пахваліў сваіх папярэднікаў і вопытных настаўнікаў, што ў складаныя пасляваенныя і пазнейшыя часы ўмелі пераадолець цяжкасці і навучаць на вельмі высокім узроўні. Беластоцкі куратар асветы Зофія Транцыгер-Кочук успамінала пра спаборніцтва паміж Педагагічным ліцэем у Бельску, у якім яна вучылася, і Бельскім белліцэем. Заявіла яна, што зараз Бельскі белліцэй добра падрыхтаваны да адукацыі маладога пакалення. Са словамі падзякі за адукацыйную працу выступіў таксама старшыня ГП БГКТ Ян Сычэўскі.




Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

*Вучні трэціх класаў патрапілі зацікавіць публіку сваімі мастацкімі выступленнямі*



Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

*У невялікай спартыўнай зале было крыху цеснавата. Аднак сабраных радавала цёплая атмасфера*

— Не будзе ў нас беларускай культуры без беларускага ліцэя. Выпускнікі Бельскага ліцэя з беларускай адметнасцю таксама ўдала знайшлі сваё месца ў сусветнай культуры. Трэба памятаць аб былых настаўніках і выпускніках (закончыла вучобу 4 253 асобы — А. М.) і на аснове мінулага ствараць будучыню, — заявіў старшыня Беларускага саюза ў РП Яўген Вапа, які дырэктару Андрэю Сцепанюку ўручыў вялікі букет кветак з бел-чырвона-белымі стужкамі.

Сярод сабраных была Святлана Сычэўская, дачка славутага дырэктара Яраслава Кастыцэвіча, якога вельмі цёпла ўспаміналі выпускнікі.

— Нашаму дырэктару Яраславу Кастыцэвічу трэба было б помнік паставіць. Ён жа на веласіпедзе ездзіў па вёсках і заахвочваў вучняў пачатковых школ паступаць у беларускі ліцэй. Я добра ўспамінаю ўсіх сваіх настаўнікаў. Асабліва мне запамятаўся настаўнік беларускай мовы Ілья Бернат, які прывіваў любоў да беларускай мовы і культуры, — сказаў Мікола Красоўскі — вучань, а пасля шматгадовы настаўнік белліцэя.



Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

*Гарачыя дыскусіі адбываліся таксама перад школай*

Сабраныя з пашанай успаміналі іншых дырэктараў — Анатоля Тымінскага, Міколу Гайдука і Зінаіду Навіцкую. Былы дырэктар Аляксей Карпюк дзякаваў сваім настаўнікам, якія разам з вучнямі стварылі высокі ўзровень навучання і папрасіў прабачэння ў выхаванцаў, якіх занадта моцна заахвочваў удзельнічаць у школьных алімпіядах і конкурсах. У час ягонага дырэктарства вучні белліцэя дабіваліся вельмі высокіх рэзультатаў на прадметных алімпіядах.

Мерапрыемства ўдала вялі журналісты Польскага радыё Маргарыта Пракапюк і Яраслаў Іванюк, якія таксама з'яўляюцца выпускнікамі Бельскага белліцэя. Добра запамяталі яны свае матуральныя экзамены, якія пісалі седзячы ў першым радзе перад камісіяй.

З беларускімі песнямі і танцамі выступілі ліцэісты трэціх класаў. Дэкламавалі яны патрыятычныя і задуменныя вершы, а таксама напаміналі прысутным пра гісторыю сваёй школы. Вялікае ўражанне на прысутных зрабіла выступленне „Дзявочых нотак". Бельскія дзяўчаты прыгожымі беларускімі песнямі ўвялі выпускнікоў у настрой настальгіі па падзеях, што адбываліся ў іх школьныя гады. Сваё выступленне маладыя выканаўцы закончылі гімнам школы — „Люблю я край, старонку гэту", які праспявалі на зважай разам з сабранымі ў зале.

Выпускнікі і госці з'езда пабывалі на старых і новых могілках Бельска-Падляшскага і ў час паніхіды маліліся за душы памерлых настаўнікаў і вучняў белліцэя. Сабраныя ўсклалі кветкі на магілах і запалілі лямпачкі. У час з'езда выпускнікі спаткаліся ў бельскай ратушы, дзе адбылося адкрыццё выстаўкі „Чорна-белае і ў колеры. Жывапіс, графіка і фатаграфія выпускнікоў II Агульнаадукацыйнага ліцэя з беларускай мовай навучання ў Бельску-Падляшскім". На выстаўцы свае працы прэзентуюць былыя вучні белліцэя, якія здабылі мастацкую адукацыю ў вышэйшых навучальных установах або дабіліся поспехаў толькі дзякуючы свайму самароднаму таленту. Сярод прэзентаваных работ побач літаграфіі Малгажаты Дмітрук можна ўбачыць акварэлі Юркі Федарука, жывапіс Марка Іванчука, фатаграфіі Іаланты Кабзар, Марка Тапалеўскага, разнародныя працы Міраслава Здрайкоўскага і алейныя карціны Славаміра Рыбака.

Паўспамінаць вучобу ў белліцэі, школьныя радасці і незвычайныя здарэнні выпускнікі маглі ў час балю і класных спатканняў, якія праходзілі ў апошні дзень з'езда.

**Аляксей Мароз**

## Пагневаліся?

Сяголета не было ў Чаромсе беларускага фэсту. Чаму, дык цяжка сказаць. З таго, што мне вядома, БГКТ рыхтавала фэст на 27 жніўня. Так казалі ў Гміннай управе, ды пацвердзіла гэта ў аўторак 16 жніўня сакратар ГП БГКТ Валянціна Ласкевіч (назвала нават калектывы з Беларусі), аднак фэст не адбыўся. Чаму? Вайт такое сказаў: „За першым разам я адтэрмінаваў, за другім — БГКТ".

Што паўплывала на рашэнне Галоўнага праўлення БГКТ, каб не арганізаваць культурнае мерапрыемства ў Чаромсе? Дагэтуль беларускія фэсты ў чаромхаўскім асяроддзі карысталіся належнай пашанай. Публіка не падводзіла, але сяголета арганізатары падвялі публіку. Магу здагадвацца, што на рашэнне аб адтэрмінаванні фэсту паўплывала мая размова са старшынёй БГКТ Янам Сычэўскім, якую правёў я па тэлефоне ў гэты ж аўторак, 16 жніўня. Я прасіў старшыню, як члена праўлення Маршалкоўскай управы, падтрымаць чарамшан у справе ўтрымання чыгуначнай лініі Чаромха — Беласток (салідарнасць з чарамшанамі выказаў мітрапаліт Варшаўскі і ўсяе Польшчы Сава).

Ян Сычэўскі тлумачыў, што гэта ў кампетэнцыі віцэ-маршалка Яна Камінскага. Я быў іншай думкі, пра што сказаў суразмоўцу. Фэст не адбыўся. Няўжо старшыня пагневаўся?

Мы, беларусы, схільныя абражацца. Асабістыя пачуцці і эмоцыі ставім вышэй грамадскай справы. „Згода будуе, нязгода разбурае". Ці не час пашукаць кампрамісу? Гэта кірую перш за ўсё да публічных асоб, кіраўнікоў мясцовых самаўрадаў, устаноў ды паасобных людзей. Толькі супольна дасягнем мэту. А наша мэта — належная пашана для беларускай меншасці.

**Уладзімір Сідарук**

## У Альхоўцы

У малых пусцеючых вёсках рэдка калі адбываюцца вясёлыя ўрачыстасці.

На заканчэнне лета, 18 верасня, жыхароў Альхоўкі (Нараўчанская гміна) парадаваў аматарскі фальклорны калектыў „Нараўчанкі", які існуе ўжо шмат гадоў.

Заразмастацкім кіраўніком „Нараўчанак" з'яўляецца Пятро Скепка. Пад яго кіраўніцтвам прыметна расце выканаўчы ўзровень калектыву. У рэпертуары спевакоў з Нараўкі многа фальклорных і народных беларускіх песень.

Канцэрт у альхоўскай святліцы працягваўся паўтары гадзіны і вельмі спадабаўся старэйшым жыхарам вёскі. Варта адзначыць, што некалькі спявачак з нараўчанскага гурту гэта былыя і цяперашнія жыхаркі Альхоўкі.

„Нараўчанкі" зараз рыхтуюцца да выступлення за мяжой, у Пружанах, і гэты канцэрт патрактавалі як выязную рэпетыцыю.

Гледачы з Альхоўкі пажадалі „Нараўчанкам" далейшых поспехаў у мастацкай працы.

**Мікалай Варанецкі**

# У цяні калгаса




*Аляксандр Раманюк, Ніна Вэршка і Марыя Навумчык згодны, што гаспадарыць зараз цяжка*

Яшчэ перад Крыўцом (гміна Нарва) знаходзяцца вялікія ўчасткі поля. На вузкай дарозе, якая спалучае вёску з шашой Гайнаўка — Беласток, мінаюся з вялікім трактарам. У вёсцы старэйшыя людзі сядзяць на лавачках, а маладыя, сабраўшыся ў кучу, абмяркоўваюць свае справы. Побач драўляных і мураваных дамоў, збудаваных яшчэ пры сацыялізме, красуецца шыкарна адноўлены будынак былой падставовай школы. Адразу за вёскай відаць вялікія аборы.

### Мяняліся ўласнікі калгаса

— Вас можа паклікалі да нас гарадскія пасяленцы, якім свінячы гной смярдзіць, — пытаецца мяне жанчына, якая бачыць, што я намерваюся фатаграфаваць аборы былога калгаса. Калі я тлумачу, што цікавіць мяне ўсё вясковае мінулае, кабета супакойваецца.

— Зараз згодна з еўрасаюзнымі патрабаваннямі трэба каля абораў збудаваць умяшчальнікі на гнаёўку з-пад свіней. Пратэстуюць супраць гэтых інвестыцыяў асобы, якія перасяліліся ў нашу вёску з гарадоў. Мясцовыя жыхары звыкліся з пахам гною, — тлумачыць спадарыня Рэкоўская і дабаўляе, што ў аборах раней гадавалі каля паўтары тысячы свіней, а зараз іх можа быць крыху менш. Калі ў дзевяностых гадах паявіліся фінансавыя складанасці, калгас з Крыўца ўвайшоў у састаў буйнога сельскагаспадарчага кааператыва з Макаўкі. Год таму маёмасць макаўскага калгаса пераняло сельскагаспадарчае прадпрыемства з Беластока і яно з'яўляецца ўласнікам свінафермы побач Крыўца.

Перад вялікім прыгожым домам сядзяць Аляксандр Раманюк і яго сястра Марыя Навумчык, якія размову са мной пачынаюць з крытычнай ацэнкі гаспадарчай палітыкі ў краіне. Спыняюцца на адмоўных паслядоўнасцях гэтых працэсаў на мясцовую гаспадарчую палітыку.

— Некаторыя асобы, што працуюць у беластоцкім прадпрыемстве, якое пераняло гаспадарку макаўскага калгаса, зарабляюць 600 злотых за месяц цяжкай працы. Бывае, што атрымліваюць грошы са спазненнем, — інфармуе Марыя Навумчык.

### Вяртацца ў родную вёску

— Я жыву яшчэ ў старым доме, збудаваным у міжваенны перыяд. У гэтым доме, што за нашымі плячыма, жыве мая дачка, — тлумачыць Аляксандр Раманюк. — Калі памруць адзінокія пенсіянеры, многа дамоў можа пуставаць.

З маім суразмоўцам не згаджаецца Ніна Вэршка, якая падыходзіць да нас і ўключаецца ў размову.

— Зараз гараджане пачынаюць вяртацца на вёску. Здараецца, што выхадцы з вёсак свае блёкі пакідаюць дзецям і пераязджаюць на пастаяннае жыхарства ў бацькаўскія хаты, якія ўжо пуставалі. Мае дзеці таксама думаюць адрамантаваць наш дом у Крыўцы і, перайшоўшы на пенсію, перасяліцца ў яго. Побач вёскі ёсць лес і можна збіраць грыбы, — кажа Ніна Вэршка. У Крыўцы некалькі дамоў купілі ўжо жыхары Беластока. Можа вернуцца дамоў карэнныя жыхары Крыўца?

Ніна Вэршка разам з іншымі жанчынамі дзесяць гадоў таму заснавала вакальны калектыў „Крыўчанкі".

— У гэтым годзе мы адсвяткавалі дзесяцігадовы юбілей. На фэстах і аглядах беларускай песні мы спяваем даўнія творы, — інфармуе Ніна Вэршка.

### Размовы пенсіянераў

Побач адрамантаванага будынка былой падставовай школы сустракаю жанчын.

— Зараз добра стала жыць пенсіянерам. Грошы даюць, сядзіш на лавачцы і адпачываеш. Горш жыць маладым. Пры сацыялізме ўлады прыдзіраліся да тых, што не хацелі рабіць. Зараз многа беспрацоўных і людзі ўцякаюць за мяжу ў пошуках заробку, — кажа Люба Ляўчук.

— Мая дачка жыве ў Амерыцы, а ўнукі працуюць у Англіі. Хочуць маладыя зарабіць грошы, то едуць за мяжу. Унук, які працаваў за граніцай, за свае грошы будзе сабе вяселле ладзіць, — заяўляе спадарыня Ніна.

У Крыўцы засталося гаспадарыць крыху малодшых асоб. Зараз ёсць 5 гаспадароў, якія разгарнулі сельскагаспадарчую прадукцыю.

— Цяпер складаныя ўмовы для гаспадарання. Даражэюць машыны і сродкі аховы раслін, а збожжа прадаць цяжка. Калі ў вясковых сем'ях ёсць пенсіянеры, лягчэй гаспадарыць, бо ёсць пастаянны прыток грошай, — гаворыць старэйшая жанчына.

Пенсіянерам і гаспадарам жыццё аблягчаюць прадаўцы, якія прывозяць у Крывец прадукты. У вёсцы працуе прыватны прадуктовы магазін, дзе можна купіць падставовыя прадукты. Дадаткова ў вёску прывозяць хлеб і прадаюць яго з машыны. Прадаўцы з Беларусі прапануюць вопратку і некаторыя прамысловыя вырабы. Самае вялікае запатрабаванне на аўтол, якім гаспадары карыстаюцца ў час палявых работ. Цана яго ў прадаўцоў з Беларусі амаль у два разы ніжэйшая чым на запраўках.

### Прымаюць турыстаў

— Гэтым летам у нас адпачывала многа людзей. Была моладзь з Нарвы, Бельска, а цяпер прыехалі турысты з гор. Найчасцей нашы госці прыязджаюць на начлег, а днём ездзяць у Белавежу і наведваюць цікавейшыя месцы Гайнаўскага павета, — кажа Люба Ляўчук.

Турысты пасяляюцца ў будынку былой школы, які гмінныя ўлады передалі ў распараджэнне Праваслаўнаму прыходу ў Ласінцы. Пасля грунтоўнага рамонту выдзелілі ў ім вялікую залу для сустрэч і пакоі для гасцей. У нядзелі ў новым будынку свяшчэннікам з Ласінкі чытаюцца акафісты.

— Раней многія крыўчане дабіраліся ў прыхадскую царкву ў Ласінцы. Цяпер менш людзей ездзіць на богаслужэнні, — тлумачыць Люба Ляўчук. — Паменшала таксама колькасць людзей, якія посцяць.

— Апошнім часам школьная моладзь часцей ходзіць у царкву і больш увагі звяртае таксама на пасты. Аднак гэта ў асноўным тычыцца гарадоў, бо на вёсках жыве штораз менш дзяцей, — дабаўляе субяседніца спадарыні Любы.

У палове дзевяностых гадоў у Крыўцы ліквідавалі школу і дзяцей пачалі давозіць у Нарву. Зараз зусім мала вучняў на школьным аўтобусе адпраўляецца ў школу. Якая будзе будучыня вёскі, што многа гадоў жыла ў цяні калгаса, акажацца праз гадоў дзесяць або дваццаць. Магчыма, што тады ў дамы да састарэлых паселяцца дзеці сённяшніх пенсіянераў або чужынцы, якія купілі тут сабе апусцелыя дамы.

**Аляксей Мароз**

*Словы шчырага спачування*
*настаўніку гісторыі*
***Спадару Яўгену Янчуку***
*з прычыны напаткаўшага Яго гора*
***— смерці Бацькі Яўгена —***
*выказваюць*
*Дырэкцыя, Настаўнікі і Вучні*
*Белгімназіі і Белліцэя ў Гайнаўцы.*

*Спадару **Яўгену Янчуку***
*і ягонай сям'і словы спачування*
*ў сувязі са смерцю*
***бацькі Яўгена***
*выказваюць сябры*
*з Беларускага саюза*
*і Беларускага Самаўрадавага форуму*
*ў Польшчы*

# Сонца Карпатыі



*Грэка-каталіцкая царква ў Сэрэднім*

**Брат Дам'ян**

**— 8 —**

Цуд, калі Хрыстос перамяніў ваду ў віно, захапіў усіх, нават ворагаў. Іншы настрой, калі перамена дзейнічае ў адваротны бок. Такі антыцуд здарыўся ў сяле Сэрэдне...

Цяжка сказаць, што прывяло нас у гэты нікому невядомы куток Карпатыі. Ашчаднасць? Карціны з каровай Эндзі Ўорхала? Можа, цыганскае сонца, якое дасягнула ўжо ваўкавыйнай поўні?

Здаецца, вінаваты сам краявід, канкрэтна — вінаградны ландшафт, які пануе на русінска-венгерскім памежжы. Здавалася, дзе як дзе — тут п'юць віно як ваду. Думка нарадзілася з простай логікі. У Рэспубліцы Беларусь агародчыкі і панадворкі аздабляе бульба. Яе абажаюць не толькі ў час квітнення; яе вараць і жараць, апяваюць у песнях, славяць у паэмах. Вось і тут, у прывенгерскай Карпатыі, усе паланіны, агароды і панадворкі аздоблены вінаградам. Менавіта яны, агародчыкі, якія напаміналі зялёныя альтаны, спакусілі прызямліцца ў Сэрэднім. Суседства і шматвяковая залежнасць правінцыі ад Венгрыі абяцала бяседны, запраўлены віном настрой...

* * *

Ужо з першага кроку мы зразумелі, што замест віна і шампанскага чакае нас бульба з саломай. У Сэрэднім пахла каровай і кіслым малаком. На шырокай асфальтаванай вуліцы, быццам у Індыі, шпацыравалі каровы. Час ад часу ганяліся выслужаныя „Запарожцы". Казакі за рулём імчалі як на пагібель — сто пяцьдзесят на гадзіну. Яны не зважалі ні на кароў, ні на пешаходаў (ад іх гонак на нас аставалася штукатурка са свежых каровіных лепнякоў)!

Першых жыхароў мы сустрэлі ў магазіне, пасля паўгадзіннага маршу. Нашы пытанні пра вінаградную культуру адбіваліся гарохам аб сцяну. Каб утаймаваць злосць, мы пачалі шукаць вінаватага...

Добра што прыгадаўся любімы літаратар з Валоўца, гэта ён *падшапнуў* шырокім кругам абмінаць вялікія гарады...

— Ідзіце ў манастыр, — параілі нам добрыя цёткі, — там вас пераначуюць.

Хоць сучасны выгляд вёскі моцна назначаны калгасна-савецкай мінуўшчынай, дзе-нідзе захаваліся сляды даваеннай хвалы: царква і касцёл, два манастыры, катэджы даваенных чыноўнікаў у „сецэсіёнстылі". Апошнія, хоць зруйнаваныя, вабілі тонкасцю стылю. Нядаўна пабудавалі яшчэ грэка-каталіцкую царкву, побач якой — асабліва познім вечарам — бушуе мясцовы народ. Магнітам з'яўляецца гарэлачная крама, якая тут мяжуе з храмам.

* * *

Дзве-тры гадзіны мы выглядалі манашак-місіянерак са Славакіі. Званок ля дзвярэй сотню разоў сыграў мелодыю вядомага шэдэўра „Роскажи мэні — любіш ты чи ні?".

Надзею на сустрэчу абяцала адкрытая на ўсю шырыню ўязная брама. Калі пачало цямнець, мы рашыліся дзіка паставіць палатку між царквой і касцёлам, што, як брат і сястра, сталі побач сябе, за адным парканам.

На прыцаркоўным пляцы мы ўлавілі доўгашуканы пах віна, які даносіўся са старой плябаніі. Праўда, замест шыкоўнага букету векавога напітку, мы нюхалі шалёна-кіслы пах маладога бродзячага настою. І гэта быў штуршок! Нягледзячы на татальную стомленасць, мы заўпарціліся узяць пад кантроль мясцовыя забягалаўкі. Хоць — не. Першы кафэ-бар, дзе прыселі мы з надзеяй пасмакаваць мясцовага віна, захапіў дэкорам. На паліцах, паўз драўляныя сталы, стаялі сотні ручных прасаў, медных ступак, такіх жа ручных млынкоў. Усе экспанаты былі павязаны жалезным ланцугом.

— А што ў Сэрэднім найахвотней п'юць? — спыталі мы ў рахманага бармена.

— Як што? — здзівіўся той. — Гарэлку!

Культ Вакха немагчымы тут хоць бы з-за дзікай эканоміі. Вось за звычайнае віно (мясцовага ўвогуле не было) трэба было заплаціць у тры разы даражэй чым за бутэльку гарэліцы. Затое налілі яго ў чырвоныя і зялёныя крыштальныя чары, якія чамусьці хацелася паставіць між прасаў і ступак з ланцугамі.

Тут як у Дуклі, выседжвалі адны мужчыны, якія заказвалі гарэлку не кілішкамі, а бутэлькамі.

* * *

Калі мы вярталіся цёмнымі вуліцамі ў сваю палатку, не верылі ні вачам, ні вушам. Мясціна раптоўна прачнулася і захадзіла як пасля землятрусу. Ля магазінаў перамяшчаліся хмары моладзі і падросткаў. Хоць набліжалася поўнач, усюды грымела музыка тэхна. Стаялі парачкі ў абдымках. Пахацела летам, каханнем, малаком, агрэсіяй.

Ад такой перамены і грукату, які нёсся над сялом, мы не маглі заснуць. Здавалася яшчэ — нехта кружыць вакол нашай безабароннай палаткі.

— Мабыць, дзікія сабакі, — суцяшаліся мы як маглі, хоць зусім не было да смеху, бо, як вядома, мы не прыдбалі петардаў.

Раптам бліснула святло, пачуліся крокі і мужчынскія галасы. Начнікі падышлі да палаткі і рашуча загадалі: *Выходзь!*

Не было рады. Праўда, мы пабаяліся выйсці на двор, перамову вялі з сярэдзіны, а ўсё ахінала цямрэча як у піліпаўку...

— Naprawdę jesteście z Polski?! — пачулі мы з другога боку. — Ja studiowałem w Kalwarii Zebrzydowskiej.

У такі спосаб мы пазнаёміліся з французсканцам — братам Дам'янам з Жытоміра. У Сэрэднім дзейнічае місія французсканцаў, большасць манахаў — славакі. Аказалася, што брат Дам'ян хадзіў нашым следам ужо некалькі гадзін.

Зараз, калі мы пазнаёміліся, ён з усяго сэрца жадаў прагнаць ляк, які яшчэ дымеў ад дзіўнай сустрэчы.

— Я прынясу вам найлепшы ва ўсёй Украіне напітак...

— Вінцо!!! — уцешыліся мы...

— Нешта лепшае за вінцо, — паабяцаў манах.

— Мабыць, шампанскае?.. — падумалі мы і адразу заснулі.

Калі французсканец з'явіўся яшчэ раз, мы ўжо храплі ў тры галасы.

Раніцай каля нашай палаткі стаялі тры бутлі мінералкі.

**Тэкст і фота Евы Сцепанюк**

# *Турыстычная Гайнаўка*

Гайнаўка, што прытулілася да заходняй акраіны Белавежскай пушчы, з'яўляецца адным з наймалодшых гарадоў Падляшша. У XVIII стагоддзі была тут лесніковая сядзіба, побач якой у наступным стагоддзі ўзнікла вёска. Яе развіццю паспрыялі пушчанскія рэсурсы і пракладка чыгуначнай лініі. У міжваенны перыяд тут быў шматлюдны рабочы пасёлак. У 1927-1938 гг. у Гайнаўцы адбываліся частыя забастоўкі і выступленні працоўных. У час нямецкай акупацыі вакол горада дзейнічалі савецкія партызаны ды атрады Батальёнаў хлопскіх і АК. 17 верасня 1942 года на ўскраіне пушчы гітлераўцы расстралялі 105 жыхароў горада.

Гарадское права Гайнаўка атрымала ў 1950 годзе, а ў 1953-1975 гг. была сядзібай павятовых улад. Да часу змены грамадскага парадку ў Польшчы горад быў важным цэнтрам драўніннай і хімічнай прамысловасці.

Да прыродных каштоўнасцей Гайнаўкі трэба залічыць групу 60 запаведных дрэў на тэрыторыі горада. Да культурных каштоўнасцей належаць захаваная урбаністычная планіроўка і драўляная забудова цэнтра горада, арыгінальны ў архітэктурным плане Свята-Троіцкі сабор, іншыя сакральныя аб'екты, рабочы пасёлак, будынак хімічнай фабрыкі 1915 года ды магілкі з першай сусветнай вайны.

У Гайнаўцы працуюць Музей і асяродак беларускай культуры, Музей кавальства і слясарства, міні-скансэн пры станцыі вузкакалейкі ды міні-скансэн сацрэалізму ў „Бары ў Валодзі". У горадзе адбываюцца шматлікія мерапрыемствы: міжнародны фестываль „Гайнаўскія дні царкоўнай музыкі", канцэрты камернай і арганнай музыкі ў касцёле Уздзвіжання Святога Крыжа, беларускі фэст, фестываль рэлігійнай песні „Śpiewajmy Panu", сусветны Дзень турызму ў верасні, пешы рэйд па Белавежскай пушчы, Мікалайкавы рэйд, гайнаўскі паўмарафон і турнір пляжнага валейбола.

У Гайнаўцы пачынаецца некалькі пешых турпраходаў:

— зялёны, у Белавежу;

— „Шлях партызанскага змагання" (чырвоны) у Нараўку;

— кругавы „Шлях па слядах студэнскага паўстання" (сіні), Гайнаўка — Арэшкава — Гайнаўка.

Праз горад пралягае пяць веласіпедных маршрутаў:

— „Шлях праваслаўных храмаў" (жоўты) у Нарву і Чыжы;

— Гайнаўка — Арэшкава — Гайнаўка (сіні);

— Гайнаўка — Дубіны — Навасады — Ліпіны — Гайнаўка;

— Гайнаўка — Дубічы-Царкоўныя — Чаромха (чырвоны);

Начлежную базу Гайнаўкі складаюць два гатэлі, заезны дом і матэль (разам 223 месцы), гасцінныя пакоі ў Беларускім музеі і Доме міласэрнасці „Самаранін" (разам 23 месцы) ды адной агратурыстычнай кватэры (5 месц). Гастраномія, гэта тры рэстараны і некалькі бараў.

**Міхал Мінцэвіч**



Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка
для дзяцей і моладзі

*Міра Лукша*

## *Зайчыкі*

*Ой, які ты, зайка, трусік,*
*Следам толькі за мамусяй,*
*Ні направа, ні набок,*
*За матулькай скок ды скок?..*
*У зайчыхі свае справы:*
*У карчах, у зеллі, у травах,*
*Навучыла ўжо самога*
*Сынка есці маладога,*
*Ужо не поіць малачком*
*Малалетка пад кустом,*
*А далей ён — „мамін сын”,*
*Ды каб толькі ён адзін!*
*Хутка зайчыкі растуць.*
*Хутка сем’і заснуюць...*
*Да зайчыхі, ужо як бабкі,*
*Унучкі прыйдуць гуляць „у ладкі”,*
*І ўявіце сабе, дзеці,*
*Вось такое дзіва ў свеце:*
*І яна накорміць унукаў,*
*Малака дасць без прынукі!*
*Дзе ні знойдуць зайчанятак*
*(а іх у полі — як зярнятак),*
*Мама, цётка нават бабка,*
*Дык накормяць мальцаў хватка,*
*Нат чужыя — як свае,*
*Малачка усім дае*
*Мама зайчая.*
*Свая.*
*Вось якая ў іх сям’я!*



Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

*На летніку ў Сацах*

# Воўчае сяброўства

На лясной палянцы жыла сям’я зайчыкаў. Дружна яны пажывалі, запрашалі да сябе гасцей, госці прыходзілі да іх. Але хутка набліжалася свята — самы старэйшы хлопчык-зайчык павінен быў пайсці ў школу, у першы клас. Гэта было свята для ўсёй сям’і. Мама-зайчыха ўстала рана, падсмажыла капуснае лісце, хлопчык-зайчык хуценька паеў і пайшоў у школу з вялікім-вялікім качаном капусты ў руках. Дзень выдаўся сонечны, цёплы. Хораша было на душы ў зайчыка — ён жа ішоў першы раз у школу!

Школа стаяла на лясной палянцы. Агледзеўся зайчык: як тут прыгожа, сонечна, весела! А колькі сабралася школьнікаў-зверанят?! Выйшаў дырэктар школы, строгі і высокі лось. Усе вучні-зверанякі сталі ў лінейку. Дырэктар сказаў прамову, потым запрасіў усіх у клас. Зайчык забег у свой першы клас і о... усе месцы заняты!

— А дзе ж сесці мне? — разгублена запытаў ён. І тут заўважыў адну пустую парту, хуценька падбег і сеў. Сумна стала яму, што будзе сядзець без прыяцеля.

Зайшоў важны настаўнік-бабёр і заняў сваё месца за сталом. Хвілінку-другую ён памаўчаў, падумаў, паглядзеў на вучняў сваімі строгімі вачыма, а потым сказаў зайчаняці перасесці на першую парту. І... о, тут жа сядзела — хто б вы думалі? — ваўчаня,



Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

*Насценгазетка Віктара Шведа*

якога зайчык баяўся больш за ўсіх на свеце. Ён увесь затросся і так спалохаўся, што не мог вымавіць і слова. Але не па сваёй волі пайшоў і сеў за парту да ваўчаняці. Тое лагодна зірнула на зайчаня, і сэрца ў яго перастала спужана стукаць. Настрой у яго падняўся, і ўрокі хутка закончыліся. Выбег зайчык на парог школы, а тут яго чакала ваўчаня. Яно сказала, што яго бацька важны міністр і прыедзе за ім на машыне. Калі зайчык хоча, то яны і яго падвязуць дамоў. І праўда, пад’ехаў чорны „мерседэс”, і ваўчаня, схапіўшы зайчыка за лапку, хутка пацягнула яго ў машыну.

Стары воўк толькі скоса паглядзеў на таварышаў і падумаў: добрая вячэра будзе сёння. Але сынок-ваўчаня не дазволіў нават пальцам дакрануцца да свайго новага сябра. Давезлі зайчыка да яго норкі-хаткі і высадзілі, хоць стары воўк і аблізваўся.

Непрыкметна праляцеў год вучобы. Ваўчаня і зайчаня гэтак здружыліся, што ва ўсёй школе лепшых сяброў нельга было знайсці. Ваўчаня бачыла, у якой хатцы-норцы жыло зайчаня, і яму было шкада яго вялікую сям’ю. Ваўчанятка стала прасіць свайго бацьку-міністра, каб ён дапамог „выбіць” кватэру для мнагадзетнай зайчыкавай сям’і. Воўк-бацька думаў дзень, думаў другі... і, нарэшце, сказаў свайму сыну-ваўчаняці, каб яго таварыш з сям’ёй перасяліўся ў пусты катэдж насупраць іх.

Заечая сям’я спачатку не паверыла, што воўк можа быць такі добры. Справілі наваселле зайчыкі, і ваўкі-суседзі ў гасцях былі. А праз тыдзень зайчаняці не стала ў школе. Ваўчаня непакоілася, вырашыла зайсці ў госці да таварыша, але хата была зачынена на замок. Пабегла ваўчаня, пабегла, ды нікога не знайшло. Вырашыла спытаць вечарам у свайго бацькі-міністра. Але бацькі доўга не было з работы, а маці, калі ваўчаня прыйшло дамоў, пасадзіла яго есці і падала на стол вараную зайчаціну. „Дзе ж яна ўзяла такое мяса?” — падумалася ваўчаняці. І тут у галаву прыйшла думка: вось дзе падзеўся мой таварыш! Усёй душой узненавідзеў сынваўчаня свайго бацьку і назаўсёды вырашыў пакінуць сваю воўчую сям’ю.

***Уладзімір Васіленка, 7 клас,***
***Гродзенская вобласць, Свіслацкі раён, Дабравольская СШ***
***„Казкі дзяцей Беларусі”***

# Драч-дзяркач

„Крэкс-крэкс!" — скрыпуча дзярэцца ў шлюбны перыяд ноччу драч, так і яго назвалі па-латыні — *Crex crex*. „Дэр-дэр!" Гэта птушка сям'і пастушковых атрада жураўлепадобных вядомая ў Заходняй Еўропе і Малой Азіі, на поўначы Ірана, у Заходняй і Сярэдняй Сібіры. У нас пералётны від, трапляецца на поймавых лугах, на высечках, з другой паловы ліпеня на палях і агародах. Актыўны пераважна ўначы. Корміцца насякомымі, слімакамі, дажджавымі чарвякамі, насеннем. Даўжыня цела драча да 22 см, маса да 161 грама. Зверху драч паласаты, валляк і грудзі ў яго з вохрыстым адценнем, сярэдзіна грудзей і жывот белаватыя, бакі цела вохрыста-рыжыя з белымі папярочнымі палосамі. Дзюбу мае ён моцную, кароткую. Бегае вельмі хутка, перамяшчаецца ў траве непрыкметна, лятае неахвотна. Прылятае ў канцы красавіка і маі. Гняздо драча — ямка, схаваная пад кустом або на купіне, высланая сенам. Нясе да 20 бледных яек з фіялетавымі, чырвона-бурымі і светла-шэрымі плямкамі, наседжвае іх да 17 сутак. Драчаняты выводзяцца ў другой палове чэрвеня, пачынаюць лятаць з сярэдзіны да канца ліпеня. Увосені драчы вельмі тлустыя. Драч адлятае ў канцы верасня і кастрычніку, зімуе ў Міжземнамор'і і Афрыцы. Вернецца, і з крылатага падарожніка мяняецца ў пешахода. Убачыць яго ў травах цяжка, затое голас мае небывалую сілу: з 30 сантыметраў дэрканне дзеркача мае такую натугу гуку, як рухавік грузавіка — 20 дэцыбелаў. За адну ноч самец драча можа выдаць з сябе больш за 20 тысяч паасобных гукаў. Адразу пасля прылёту драч дэркае мала, ад 80 раз у хвіліну, пасля пачынае дэркаць як шалёны — да 120 „дэркаў" у хвіліну. Як кажа Адам Вайрак, журналіст, знаўца пушчанскай фауны, гэта дзеля таго, каб знайсці пару ў джунглях ды зазначыць сваю тэрыторыю і абараніць сям'ю. Бо тая трава, у якой мы не ў змозе звочыць драча, для яго — сапраўды джунглі.



Драч таксама аб'ект палявання, асабліва ўвосень, калі добра наядаецца, збіраючыся ў вырай. Гатуюць ягонае вельмі смачнае мяса як перапёлку ці фазана. Што ж зробіш — такое жыццё. Уся Зямля — месца змагання. Калі ты не ўпалюеш — упалююць цябе!..

**Міра Лукша**



Фота Міры Лукшы

*Міхась Хмялеўскі і Пятрусь Стэльмашук*

# Тры Паўліны і Паўл

Першы ўрок праходзіў у падвале. Ян Дубаля, настаўнік матэматыкі, загадаў схаваць сшыткі, ды ўсякія „дапаможнікі", як казаў ён пра шпаргалкі.

— Праверым вашы веды, — сцвердзіў ён тонам, які не пераносіць супраціву.

— Ы...ы..! — пачулася з другога боку.

Дубаля закрунуўся на пяце, засмяяўся, а пасля насупіўся:

— Не „ыкаць" мне з самага рання, — працадзіў ён неяк тэатральна, — годзе басурманству!

Бісурманства, паводле Дубалі, значыла адно: канікулы. Ён сам не любіў водпускаў і выхадных, вольны час лічыў часам страчаным. У нашым горадзе лічылі яго індывідам, баяліся, але, шанавалі. Найперш за выхаваўчыя прыёмы, якія ён сам прыдумаў ды прымяняў да сваіх вучняў. Пад уплывам яго праграмы, якую зацвердзілі і нават узнагародзілі асветныя ўлады, найгоршыя вучні часта станавіліся першымі. Наогул, усе хацелі быць у ягоным класе. Гэта абазначала адно — канец нуды ды калупання ў носе на ўроках. Усе мелі „хадзіць" як найлепшы гадзіннік.

Праўда, метады Яна Дубалі наводзілі жах. Як зараз, калі ў галовах гімназістаў гудзеў яшчэ жнівеньскі вецер, а ён ужо пра кантрольныя! З другога боку ніхто не адважыўся пратэставаць. Ян Дубаля, як кожны геній, не пераносіў крытыкі. Часам, калі нехта асмеліўся ўзяць слова, настаўнік адкрыта гразіў: пачакай галубчык, заўтра заспяваеш! Вядома, не ішло тут пра музыку. Наступныя пяць урокаў, дзень у дзень, увесь клас пісаў кантрольныя па матэматыцы. Кожны вучань быў вымушаны прыдумаць задачу на аснове ашуканстваў, якіх дапусціўся на ўроках. Каб задаволіць настаўніка, многія прыдумвалі факты, якія пасля хадзілі па школе як жывыя легенды.

Паўл сядзеў як мыш пад мятлой і туліў вушы. Праз свае раманы ён забыўся нават множнай табліцы. Яго ўся „надзея" — Паўліна Ц. упершыню села сама. Гэта ад яе Паўл гадамі перапісваў задачы, якіх сам не паспеў вырашыць. Спачатку Паўл хацеў хуценька перасесціся і папрасіць у сяброўкі прабачэння. Прыдумаць нешта...

— Гэй ты! — грымнуў Дубаля ў бок Паўля. — Хадзі, галубчык!

Настаўнік матэматыкі меў яшчэ адну страшную рысу — ён умеў чытаць у думках сваіх выхаванцаў.

Вось і зараз ён паклікаў да сябе Паўля і пасадзіў яго за сваім столікам-катэдрай!

— Ну!.. — захіхікаў Дубаля — ну, пакажы нам, які з цябе мужчына!

*(працяг будзе)*

**Арабінка**

## Вершы Віктара Шведа

*Кілаграм на мокра*

*На фізікі ўроку*
*Запыталі Лёўку:*
*— Скажы нам, абібоку,*
*Што гэта літроўка?*

*Нядоўга марудзіць*
*Падказчыца Ёлька:*
*— Кілаграм гэта будзе,*
*Ды на мокра толькі.*

*Чаму нудзіцца сынок?*

*Прыкмеціла раптоўна маці,*
*Што нудзіцца сынок у хаце.*
*— Бачу, сумуеш ты няспынна,*
*З Фомай пасябраваць павінен.*

*Хто хлусіць, б'ецца, праклінае,*
*Таго заўсёды абмінаюць.*
*Мама пацвердзіла, вядома.*
*Са мной гуляць не хоча Фома.*

*Дыялог у цягніку*

*У цягніку да пасажыра*
*Кандуктар азваўся шчыра:*
*— Прашу білет*
*У шырокі свет.*

*— Трэба было ў міжчасе*
*Купіць білет у касе.*
*Я не прадаю*
*Уласнасць сваю.*

# Польска-беларуская крыжаванка № 40

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў "Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Parasol | ▼ | Pas | ▼ | Gorączka / Sówka | ▼ | Łódka | Ścieżka | ▼ |
| ▶ | | | | ▼ | | | Jar | |
| Makówka | | Kąt | ▶ | | | Ród | ▶ | |
| ▶ | ▼ | | | | | | 📖 | |
| Suczka | ▶ | | | | | Imię chińskie | Ar | |
| ▶ | | | | | Lakier | ▶ ▼ | ▼ | |
| Chatka | 📖 | 📖 | | Lira | ▶ | | | |

**Адказ на крыжаванку № 36:** Бор, яр, крупка, бручка, рука, рэха, тата, матор, матыў, ара, пан, астра, крама. Бант, такс, брат, круты, рукаў, куча, Марк, кара, этап, двор, барана.

*Ячна, як многія навакольныя вёскі — у палове праваслаўнае, у палове — каталіцкае. Тут асаблівы цэнтр праваслаўя: дзве царквы — прыхадская і драўляная капліца на могілках у канцы вёскі, каплічка-філіял у недалёкай Сідэрцы ды Асяродак брацтва...*

# 15 мярлін і адны хрысціны

Купалы царквы ў Ячне размаляваныя на васількова-блакітны колер. Відаць іх ужо ў Дуброве-Беластоцкай. Размалявалі іх альпіністы з Беларусі. Тут, у далёкім мінулым, здзейсніўся цуд. А было гэта так: ва ўрочышчы Красны Стаў знаходзілася каплічка з іконай Божай Маці. Каплічка патрабавала рамонту.Ужо раней людзі задумалі пабудаваць царкву ў Грабянях. Вось і тады, запрэглі яны пару валоў, паклалі ікону на воз і рушылі ў бок новай царквы. У Ячне валы нечакана затармазілі. Як не паганялі іх, як не пужалі — жывёла стаяла як укапаная. У здарэнні пабачылі Божы знак і пабудавалі царкву. Ікона славілася цудамі на працягу стагоддзяў, перажывала жахі бежанства і войнаў, каб згарэць у час дабрабыту і міру.

* * *

У пачатку вёскі прывітаў мяне пах лясной дрыгвы. Залятаў ён з пакінутага, зруйнаванага двара, з-за тоўстага частаколу. За ім, быццам у заапарку, рохкалі дзікі. Іх гаспадар, чалавек мястовы, толькі зрэдку наведвае сваю дзікую ферму. Падкіне яду, загародзіць жэрдкай дзіру ў плоце. Бывае, дзікі ўцякаюць з панадворка, бегаюць па вуліцы і наводзяць жах. Таму неабходным рэквізітам ёсць тут тоўсты кол у руцэ, якім карыстаюцца асабліва вечарам.

Дзікагадоўля мяжуе з Асяродкам адпачынку, які вядзе тут Брацтва праваслаўнай моладзі. Знаходзіцца ён у будынку старой плябаніі, побач новай царквы. У сярэдзіне камінак, на якім радком красуюцца іконы.

Быццам, для кантрасту, ззаду царкоўнага пляца, у сучасным і дагледжаным двары-гаспадарстве, пасвіцца статак коней. Тут, у сваю чаргу, вядзецца гадоўля коней сакольскай пароды.

— Добры дзень! — кідаю на прывітанне першай сустрэтай жанчыне. У адказ — маўчанне. Крыху здзіўляюся: дзе, як не ў вёсцы, людзі памятаюць пра формы ветлівасці?!

Ячна, як многія навакольныя вёскі — у палове праваслаўнае, у палове — каталіцкае. Праўда, тут асаблівы цэнтр праваслаўя: дзве царквы — прыхадская і драўляная капліца на могілках у канцы вёскі, каплічка-філіял у недалёкай Сідэрцы ды Асяродак брацтва. Апошні цэнтр як магніт прыцягвае маладых. Асабліва, калі прыязджаюць студэнткі-братчыцы з Беластока. Іх следам з'язджаюцца праваслаўныя кавалеры з наваколля, якія гатовы дзень і ноч несці дапамогу, рыхтаваць дровы на вогнішча ды ахоўваць ад дзікоў.

Хоць мясцовыя жыхары размаўляюць тут *па-просту* (на Беласточчыне дыялектам самым блізкім беларускай літаратурнай мове), беларусамі лічаць адно праваслаўных. Таму блакітныя купалы ў новай царкве слепяць сапернікаў.

— Калі мы прыйшлі сюды на парафію, многія нас проста „не бачылі", — успамінае гісторыю з 2004 года матушка Аліна Якімюк. — Мы першыя гаварылі „добры дзень!", а людзі маўчалі. Пасля мой бацюшка не вытрымаў, пасароміў маладзёнаў, што стаялі ля святліцы і праігнаравалі яго прывітанне. „No wiecie,— не вытрымаў айцец Славамір, — nawet świnia, jak wchodzi do chlewa, to rochnie".



Айцец Славамір Якімюк прычашчае

— І што, памагло?

— Зараз яны першыя кідаюць: *Szczęść Boże!*

* * *

Сёння ў новай плябаніі рух, як на вакзале. У сям'і святара трох сыноў і дачушка. Кругом іх многа мясцовых дзяцей, ёсць дзеці суседзяў-католікаў.

— А мы толькі што з грыбоў вярнуліся, — расказвае матушка Аліна. Ездзілі ўсёй сям'ёй, з дзяцьмі. У доказ паказвае кашы з баравікамі. Грыбы ўрадзілі тут ужо ў ліпені.

— Хочам паспець перад ваўкамі!

— Як — перад ваўкамі?

У адказ пачую страшны, хоць займальны расказ.

— Калі ў Беларусі пачынаецца сезон адстрэлу ваўкоў, многія з іх перасякаюць граніцу і хаваюцца ў нашых лясах. Усю восень людзі сцерагуць жывёлу. Хоць і так апошняя справа немагчымая. Ваўкі заелі тут ужо не адну карову, нават на коней кідаюцца.

— А на людзей не кідаюцца?

— Пакуль не, хоць страшна адпраўляць дзяцей пешшу ў школу.

На шчасце, пасля сезона, ваўкі вяртаюцца ў Налібоцкую пушчу. Хоць, з другога боку, атмасфера жаху ў вёсцы круглы год. Апошні „воўк" на дзвюх нагах пасяліўся ў пакінутай хаце. У канцы сяла, насупраць могілак. Новы мае славу экс-крымінальніка, якога выдварыла з горада сям'я. У час запояў ганяецца ён з сякерай па вуліцы, нават у белы дзень!

У Ячне думаюць як у нас — містычна. Прысутнасць крымінальніка як і ўсякія жахі лічаць карай за бяду, якую перажылі ў 1985 годзе.



Матушка Аліна Якімюк аздабляе царкву

* * *

Дваццаць гадоў таму, адвячоркам, у хаўтурны дзень Кузьмы і Дзям'яна, у вёсцы ўспыхнуў пажар. Гарэла царква. Людзі стаялі ачмурэлыя, царква палала як свечка, не было шанцу яе ратаваць. Згарэла датла. І разам пажарышча праглынула іх цудоўную Ікону. Сляды стыхіі захаваліся на векавых соснах, якія акаляюць новую мураваную царкву Божага Нараджэння. Якраз усярэдзіне ідзе роспіс фрэскаў. На высокіх рыштаваннях завіхаецца настаўнік жывапісу з Ружанастока Тадэвуш Мажэйка:

— Вы, пэўна, з Беларусі будзеце?

— Тутэйшы я, — пярэчыць пан Тадэвуш, — з-пад Сідры, з вёскі Кудраўка. — Пасля дадае: — І я калісьці думаў, што маё прозвішча рэдкае, а кажуць, у Беларусі Мажэйкаў процьма, ёсць і мясцовасць Мажэйкі...

Маю ўвагу прыкоўвае фрэска Святога Іллі на вогненнай калясніцы.



Царква ў Ячне

— Гэта памятка па старой Іллінскай царкве. Хоць новая перайшла пад іншага заступніка, у парафіі далей урачыста святкуюць фэст на Ілллю — 2 жніўня.

— Вялікі ваш прыход?

— Маем за трыста душ, — кажа бацюшка Славамір Якімюк, — большасць з іх старэйшыя людзі. З Герасімаўцаў, Грабянёў, Кудраўкі, Сідэркі, Сідры, Падсудак, Падрубоўшчыны. Пра тутэйшых людзей можна сказаць, што яны ахвярныя і рэлігійныя. Праўда, боязна гаварыць пра будучыню, бо тут прамаўляе сама статыстыка. Вось, на працягу апошняга года ў парафіі памерла пятнаццаць душ. А колькі нарадзілаў? Былі адны хрысціны.

Раніцай у суботу наведваю царкоўку ў Сідэрцы. У гэты дзень да прычасця падышло многа дзетак. Частка з іх прыехала ў госці да бабуль.

У Ячне прыдбалі ўжо копію спаленай іконы, хоць тая сучасная Божая Маці, — кажуць, — нейкая сумная...

**Тэкст і фота Ганны Кандрацюк**

# „Дваранкі” з Хільмонаў

**Пра калектыў мастацкай самадзейнасці „Дваранкі” з Хільмонаў-Калёніі расказвае яго кіраўнік Галіна ЯНУЦІК.**

Недзе ў палове сямідзесятых гадоў завязалі мы Кола вясковых гаспадынь. І на занятках варылі, пяклі, елі, пілі і... спявалі. Была тады з намі пані Бася з Дома культуры ў Дуброве і яна намовіла нас спяваць, заснаваць калектыў. І мы сталі збіраць песні бабуль. Па хатах збіраліся, пры нагодах спявалі. Два месяцы перад выступленнямі пачыналі рыхтавацца да мерапрыемства. Некалькі разоў прыязджаў да нас Сцяпан Копа, дапамагаў нам рыхтавацца да агляду. Спярша яшчэ мой муж крыху падыгрываў нам на акардэоне. Але моладзь і мужчын цяжка было прыцягнуць да калектыву. Ды цяпер і маладзі няма, выехала ў горад. Вёска замірае. У Хільмонах-Вёсцы асталося трох гаспадароў, а ў Хільмонах-Калёніі — двух. Вельмі многа пустых хат; а колькі ўжо знеслі!



*Калектыў „Дваранкі” з вянком на дажынках у Райградзе. Злева направа: Ірэна Януцік, Надзея Шчэрбач, Галіна Варанецкая, Марыя Палубінская, Галіна Януцік, Надзея Борыс, Галіна Барко, Анна Шчэрбач*

Спачатку польскія песні, даўнейшыя, спявалі мы па дажынках. Сёлета слабы ўраджай і ў нас дажынак не ладзілі. Раней бывалі мы ў Рудцы, Сямятычах, Бельску, Гайнаўцы, Сухаволі, на аглядзе фальклорных песняў. На аглядах беларускай песні раней, калі было менш калектываў, мы дабіваліся высокіх месц. Раз былі другія, раз трэція. А цяпер, калі калектываў многа, нам складана прабіцца.

Спярша Аркадзь Суліма дапамог нам аформіць уборы, чорныя, а пасля ўсім занялася Гмінная ўправа ў Новым Дворы. Цяпер у нас па два камплекты ўбораў — зялёныя і чорныя. Наш войт Казімеж Богуш вельмі добры, згаворлівы. Гміна дала нам нават транспарт на мамаграфію ў Беласток! 23 кастрычніка г.г. гміна ладзіць нам юбілей 25-годдзя калектыву.

У гміне справамі культуры займаецца Кшыштаф Хайнацкі, і калі Беларускае грамадска-культурнае таварыства ладзіць нейкае мерапрыемства, дык паведамляюць або яго, або спадарыня Ласкевіч звоніць два-тры тыдні да конкурсу непасрэдна да нас і мы тады самі рыхтуемся. Калі якая мелодыя нам не падабаецца, тады яе перарабляем так, каб было лягчэй спяваць. Усе традыцыйныя песні — і польскія, і беларускія — завучылі мы ад старэйшых. І ў Новым Двары ў царкве спяваем.

У маёй сям'і ў Кудраўцы ўсе спявалі. Было нас шасцёра і мы спявалі нават на галасы. І гэтую любоў да песні я вынесла з роднай хаты.

Ад нейкіх пяці гадоў робім мы дажынкавыя вянкі, самі іх рыхтуем. Сушым збожжа, і кветкі палявыя і агародныя падбіраем так, каб яны два агляды — павятовы і ваяводскі — вытрымалі. Дажынкавыя вянкі мы навучыліся выплятаць самі па сабе. З гміны толькі каркас нам нарыхтуюць такі, які мы самі прыдумаем і закажам. Наш вянок у 2001 годзе на ваяводскіх дажынках у Крыпне заняў трэцяе месца сярод сямідзесяці. У 2002 годзе мы перамаглі ў павятовых спаборніцтвах у Кузніцы, а на ваяводскіх дажынках у Райградзе мы атрымалі вылучэнне ваяводы.

**Запісаў Аляксандр Вярбіцкі**

# *Галена Гулько*



Фота МІРЫ ЛУКШЫ

Пасля сарака гадоў працы ў адміністрацыі Беластоцкай політэхнікі 1 ліпеня 1991 года Галена Гулько адышла на ранейшую пенсію. Спачатку мела ўражанне, што адправілі яе ў адпачынак. Цешылася, што ўрэшце зоймецца хатняй працай, на якую ўсё ёй не хапала часу. Пасля кароткага адпачынку з мужам вырашылі адрамантаваць кватэру. Пасля адпачывалі на сваім участку, дыхалі свежым паветрам, загаралі... Гэтак цяпер летам і восенню, калі гаспадыня робіць свае экалагічныя вырабы. Зімой больш яна прабывае дома. Тады больш у яе часу на чытанне, пісанне, вязанне ды вышыванне і іншыя хатнія работы. *Што было добрае, пайшло ўсё ў даль. Моладасць уцякла, найбольш яе жаль...* — піша ў сваім вершы Галена Гулько, якая не раз гасціла на старонках „Нівы” сваімі звычайнымі вершамі пра жыццё. Гэтых вершаў назбіралася на кніжку, якую выдала яна сама. *Мінулае захаванае ў памяці.* Аздобленая яна фотаздымкамі з жыцця аўтаркі і яе карцінамі ды вышыванкамі.

Пачынаецца кніжачка вершам „Мае карані”. Ад таго часу, калі ў сонечнае ранне 1934 года, у Грыбаўцах каля Гарадка, у сям'і Абрамовічаў нарадзілася маленькая Галенка. Ужо быў у яе сямігадовы брацік ды старэйшая сястра Настасся, якая працавала педагогам. У час акупацыі маці нарадзіла яшчэ Міхася... У наступных вершах аўтарка прыгадвае свае школы, вёску Грыбаўцы, жыццё ў Беластоку па вуліцы Старабаярскай, 8, на Баярах, ад мая 1950 года, і перамены аж да сёння гэтага раёна Беластока, які, на жаль, не застаўся скансэнам гарадскога старога будаўніцтва... Успамінае сваіх сяброў, сябровак. Пераплятаецца гэта пытаннямі, якія турбуюць кожнага *эмэрыта*, адарванага ад працы, якая была аграмаднай часткай яго жыцця, бывае, адчувае сябе непатрэбным грамадству. „Хто гэта такі эмэрыта? Ён адсаджаны ад карыта...” Кожны міг у спавольненым жыцці — падзея. Вось, 20 мая, на *значны дзень* імянін мужа Базыля, а 22 — Галены, і адсвяткаваць гэтыя дні трэба гожа, а 16 чэрвеня — імяніны Юркі. Імяніннік атрымае, апроч верша, *гафтаваныя кветкі, асаджаныя ў рамы — ад мамы.* Верш на шлюб Марка і Касі. Пажаданні маладой пары. Малым юбілярам. Зімы і вёсны. Сямейныя святы. Устанаўленне сямейных помнікаў. Уваход у 2000 год. Змаганні з нямогласцямі. Засухі і іншыя плягі на нашай зямлі. Мноjжацца пытанні, *як годна жыць, з гонарам дажыць.* Хто падманшчык, хто п'яніца, хто палітык, хто працаголік, а хто лянівец... *Словы прадуманыя ды на паперы запісаныя...*

Кніга Галены Галько — памятка перш за ўсё для яе і яе сяброў. Таму яна яе і выдала. „Каб след застаўся”, — кажа. Пра эмоцыі, успаміны, асацыяцыі. Усе мы будзем пенсіянерамі, калі дажывем, і варта мець нейкую *пасію*, і падзяліцца з іншымі. Набыць і пачытаць кніжку з аўтографам спадарыні Галены Гулько можна на розных святах беларускай культуры. І, перш за ўсё, паразмаўляць з добрым, годным, сумленным чалавекам, які жыццё не змарнаваў і глядзіць на свет з не меншай цікаўнасцю, як дзяўчынка з Грыбаўцоў сярод лясоў.

**Міра Лукша**

# *Святлана Іванова*



Нарадзілася ў 1959 годзе ў вёсцы Індура Гродзенскага раёна. Яе бацька Канстанцін Стрыхарчук нарадзіўся ў вёсцы Даўнева, што каля Каралёвага Моста, у Гарадоцкай гміне. У 1978 годзе закончыла Гродзенскае медвучылішча. Друкуецца ў перыядычным беларускім друку з 1994 года. Ад нядаўна жыве і працуе ў Беластоку.

## *Роднай мове*

*Мне вельмі сорамна прызнацца,*
*Што толькі ў поўных сорак пяць*
*Табе магу я пакланяцца,*
*Табе магу я ўсё аддаць.*
*К табе імкнуся ў час пакою*
*І ў хваляванні ты са мной.*
*К табе з бясконцаю тугою*
*Бягу ў падворак на пастой.*
*Ты атулі мяне пяшчотай,*
*Не адцурайся ў час ліхі,*
*Прабач, з дарогі я далёкай,*
*Прабач мне за мае грахі.*

## *Дзякуй*

*Дзякуй, магутны Божа!*
*Дзякуй за новы дзень.*
*За ўрадлівасць збожжа,*
*І за начны прамень.*
*За ручаіны, дрэвы,*
*Дзякуй за родны кут.*
*Дзякуй за птушак спевы,*
*Сэрца спявае тут.*
*Дзякуй за хлеб духмяны,*
*За хараство вясны.*
*І за масток драўляны,*
*За пачуццё і сны.*
*За маляўнічасць мовы,*
*Ласкавасць маці рук,*
*За дарагія словы,*
*Радасць, кахання гук!*

* * *

*У гэтым я не бачу здрады —*
*Няхай не крыўдзіць мяне лёс,*
*Я ўцякаю ад улады,*
*Што час ліхі да нас прынёс.*
*Ад шэрых будняў, ад турботы,*
*Ад немагчымасці быцця.*
*Бягу найпрост да адзіноты —*
*Ці ў гэтым сэнс майго жыцця?*

**Святлана Іванова**



# www.mobiscar.by

Сітуацыя з беларускай мовай у Беларусі настолькі фенаменальная, што, пэўна, калісьці будзе прадметам доўгага і вельмі ўважлівага вывучэння не адным пакаленнем мова- і грамадстваазнаўцаў. Кпіны і здзекі з беларушчыны з высокіх трыбун добра было чуваць каля дзесяці гадоў таму (успомнім словы Лукашэнкі, што ў свеце ёсць толькі дзве вялікія мовы — расійская і англійская, а беларуская, трэба разумець, нічога нявартая), ды і цяпер адносіны да яе з большага пагоршыліся — у школах буйных гарадоў цяжка знайсці нават клас, дзе б прадметы выкладаліся па-беларуску. З логікі такой сітуацыі можна зрабіць толькі адну выснову — беларуская мова настолькі дрэнная і нікому, у першую чаргу беларусам, непатрэбная, што слушней пра яе забыцца. Але рэчаіснасць мае ўласную логіку, якую цяперашнім беларускім дзяржаўным дзеячам наўрад ці ўдасца зразумець.

Прыгнечаную беларускую мову бяруць на ўзбраенне тыя, каму яна, здавалася б, як „не прышый кабыле хвост” — замежныя вытворцы разнастайных тавараў. Так, напрыклад, паўднёвакарэйскі Самсунг выдатна выкарыстоўвае білборды на вуліцах беларускіх гарадоў, каб рэкламаваць сваю прадукцыю па-беларуску. Інтэрнэтныя сайты кампаній таксама не выключэнне ў рэкламе на мове Скарыны. Справа гэтая настолькі неардынарная, што на яе варта звярнуць увагу, паняволі рэкламуючы тую ці іншую фірму як выкарыстальніка беларускамоўнага маркетынгу, але можа гэта дасць добры прыклад іншым бізнесоўцам.

Сайт кампаніі „Мабіскар” месціцца па адрасе http://www.mobiscar.by. Зроблены ён адпаведна дызайну іншых інтэрнэт-старонак, якія з'яўляюцца віртуальным тварам фірмы. Пад назвай сайта месціцца дэвіз кампаніі: „Наша аўташкло — ўпрыгожанне Вашай машыны”. Побач з гэтым надпісам на блакітным фоне зьмяняюцца грузавыя і легкавыя аўтамабілі, аўтобусы, да якіх „Мабіскар” прапануе сваё шкло, і з'яўляюцца словы „Супермаркет аўташкла”.

Як звычайна, уверсе размешчаны выйсці да іншых старонак сайта. Там можна прачытаць аб навінах кампаніі, паглядзець каталог прадукцыі, якую „Мабіскар” прапануе сваім кліентам, даведацца аб розных сервісных паслугах і гарантыях, што дае фірма. Для тых, каму патрэбнае шкло для свайго аўтамабіля і ён давярае данай фірме, карыснай будзе рубрыка „Заказаць”. Праз гэтую старонку кліент можа заявіць „Мабіскару” аб сваім жаданні і фірма ў хуткім часе скантактуе з аўтааматарам. Вельмі карыснай падаецца старонка „FAQ”, дзе можна задаць пытанні, а таксама даведацца што азначаюць розныя значкі на аўтамабільным шкле.

Як і кожная фірма, якая дбае аб сваім іміджу і папулярызацыі брэнду, „Мабіскар” цікавіцца якім чынам аб ім даведаліся тых, хто заходзіць на сайт. У прапанаваным наборы адказаў найбольш часта згадваюцца пошукавыя сістэмы.

На жаль, даведацца, праз чый капітал утворана фірма, на сайце немагчыма. Не паведамляецца. З інфармацыі аб кампаніі вынікае тое, што працуе яна як у Беларусі, так і ў Расіі. Дарэчы, сайт мае рускамоўную версію.

Вядома, што мова жыве, пакуль на ёй размаўляюць. Беларускай мовай у Беларусі прыцягваюць увагу да сябе камерсанты, часцей замежныя. Ці былі ў гісторыі падобныя феномены?

**Уладзімір Лапцэвіч**

*Нашы баскетбалісткі здолелі перамагчы ў ключавым матчы ў гасцях Нарвегію, выйграць насуперак нашаму менталітэту — перамагчы ў неспрыяльнай сітуацыі...*

# Беларусь, беларусы...

**Насуперак менталітэту**

Чарговы спартовы выпуск меў быць прысвечаны веслярам на байдарках. Аднак, планы скарэктавала беларуская жаночая баскетбольная дружына. І вось чаму. Надта ж ужо беспрасветным выдаўся верасень для нашых нацыянальных дружын па гульнёвых відах. Поўнае фіяска пеpажылі футбалісты. Шматгадовы лідэр футбольнай зборнай Валянцін Бялькевіч пасля перажытага расчаравання напат абвясціў пра завяршэнне выступаў за „нацыяналку”. Не менш зганьбіліся і баскетбалісты. У сваёй групе дывізіёна „В” беларусы лічыліся фаварытамі, былі лідэрамі, але пасля няздарна саступілі супернікам. І каму — Кіпру і Аўстрыі, якія не маюць грунтоўных баскетбольных традыцый. Аніякія тут апраўданні былі не да месца, бо перамагаць Аўстрыю на сваёй пляцоўцы можна і трэба было ў кожным разе.

А вось нашы баскетбалісткі здолелі перамагчы ў ключавым матчы ў гасцях Нарвегію, выйграць насуперак нашаму менталітэту, бо беларусы так рэдка перамагаюць у неспрыяльных сітуацыях. Дыспазіцыя была такой — дома беларускі апярэдзілі нарвежак з розніцай толькі ў адно ачко. Астатніх супернікаў па групе абедзве каманды адолелі ці перамагалі апрыёры. А гэта азначала, што матч у Скандынавіі быў вырашальным. Ажно ў другім (!) авертайме вікторыю ўрэшце святкавалі беларускі — 84:78. Важнасць перамогі над Нарвегіяй — супернікам абсалютна сярэдняй рукі, найперш у тым, што дасягнута яна „на характары”. Да ўсяго Анастасія Верамеенка здабыла маральную падтрымку для брата Уладзіміра — лідэра мужчынскай зборнай, а Тацяна Траіна для мужа — Андрэя Крыванаса — капітана беларускай дружыны, якая сваё заданне не выканала.

Пасля фактычнай заваёвы месца ў дывізіёне „А” нашы дзяўчаты дома „размазалі па паркеце” Мальту з фантастычным вынікам — 138:19. Гэта самая буйная перамога ў гісторыі еўрапейскага баскетбола на роўні нацыянальных дружын.

У Беларусі ёсць цэлы шэраг цікавых трэнераў, якія працавалі ці працуюць з жаночымі камандамі — Сямён Халіпскі, Віктар Бявзяк, Аляксандр Шымкавяк, Яўген Елісееў, Анатоль Буяльскі, Рыгор Калента. Прафесія гэтая няпростая. Зусім нядаўна ў росквіце сіл памёр Анатоль Бутвілоўскі, па стане здароўя пакінуў юніёрскую дружыну Бялевіч (далей з ёй Анатоль Ваўлеў выйграў кантынентальнае першынство ў першай лізе). Сітуацыя ў нацыянальным першынстве краіны больш чым крытычная. У Беларусі зараз ледзь набіраецца чатыры каманды. Аднак, новыя „зорачкі” вырастаюць нават насуперак гаротнаму становішчу.

Сёння ў зборнай Беларусі падабралася гарманічнае спалучэнне вопытных баскетбалістак (Наталля Марчанка, сёстры Дубойскія — Аксана [цяпер яна носіць прозвішча Даўгарукава] і Анжэла, Тацяна Траіна, вярнулася пасля нараджэння дзіцяці Вольга Масіленне [у дзявоцтве Мурашкіна], Марына Крэс, Наталля Трафімава) і таленавітага маладняку (Кацярына Сныціна, Анастасія Верамеенка, Вікторыя Гаспер, Юлія Дурэйка, Алена Рынкевіч). Бальшыня з іх выступае ў польскіх і расійскіх клубах. А ёсць яшчэ Святлана Вольная, прайшоўшая школу WNBA.

І так хочацца верыць, што каманда Анатоля Буяльскага не „збуяе”.

**Уладзімір Хільмановіч**

# *Найгоршыя людзі*

*Юрась Сініцкі выйшаў з агульнага пасяджэння аб'яднанай апазіцыі вынішчаны, як прафесар філасофіі пасля працы на калгасным полі. Ад бессэнсоўных спрэчак разбалелася тое месца, якім да пасяджэння яму ўдавалася думаць. Яго сістэма кантролю над эмоцыямі, што недасведчаныя псіхолагі чамусьці называюць нервовым станам, пачала даваць збоі. Юрась здрыгануў паветра некалькімі непрыстойнымі выразамі і супакоіўся толькі тады, калі зразумеў, што ў бліжэйшай кнайпе можа купіць лекі ад нерваў. Грам сто пяцьдзесят, не болей.*

*Дзяніс Гурыновіч, наадварот, вельмі любіў спрэчкі апазіцыянераў. Гэта яму падымала настрой, як кату валяр'янка. А на гэты раз, пасля той бязглуздзіцы, якую людзі з сур'ёзнымі тварамі неслі на працягу некалькіх гадзін, настрой у Дзяніса быў такі ўзнёслы, што хацелася падтрымліваць яго як мага надалей тымі ж лекамі, якія настойліва працягвалі спакушаць Сініцкага.*

*Жаданні хлопцаў супалі. Праз колькі хвілінаў Юрась з Дзянісам ужо адкаркоўвалі першую бутэльку. На жаль, у добрай кампаніі гэтыя паўлітрухі маюць незразумелую ўласцівасць хутка заканчвацца. Сябры ўжо збіраліся развітацца, як да іх століка падышлі два мужчыны і па-беларуску спыталі дазволу прысесці. Хлопцы зірнулі на іх і зарагаталі. У адным яны распазналі афіцэра мясцовага ўпраўлення КДБ. Твар другога выглядаў так, што каб на яго ілбе была татуіроўка з сімволікай якой-небудзь апазіцыйнай партыі, то нават яна не змяніла б таямніча-шпіёнскага выгляду.*

*— З каго смяецеся? — запытаў адзін з падышоўшых.*

*— З вас, — адкінуўся на крэсле Юрась. — Няўжо ў КДБ абавязкова мець аднолькавыя, як у блізнюкоў, морды?*

*— Затое вы ўсе такія розныя, што мы вас нібыта і не пазнаём, — пакрыўдзіўся адзін з афіцэраў. — І як быццам бы вашых звычак не ведаем. Вы ж прымітыўныя, як амёбы. Пасядзіце там, на вашых сходках, пагаворыце абы пра што, каб нас заблытаць, а пасля ў кнайпу тупаеце. Робіце выгляд што гарэлку п'еце. А мы ж ведаем, што самыя галоўныя размовы якраз тут і адбываюцца.*

*Цяпер настрой пачаў падымацца і ў Юрася.*

*— А вас што, падслухаць прыслалі?! — засмяяўся ён. — Хіба іншага занятку не маеце? Усе справы парабілі? Засталося толькі за грамадзянамі ўласнай краіны цікаваць, як бабуся-пляткарка за суседзямі.*

*Афіцэраў гэтыя словы кальнулі ажно туды, дзе ў кожнага чалавека, незалежна ад прафесіі, знаходзіцца сэрца. Яны заказалі тыя ж лекі, што і апазіцыянеры, і пасля другой бутэлькі адзін зноў звярнуўся да хлопцаў.*

*— Вы чамусьці думаеце, што толькі бэнээфаўцы Беларусь любяць. А сапраўдныя патрыёты — мы. А вы нам не даеце займацца нашай непасрэднай справай. Я за гэта вас перадушыў бы як сляпых катоў. Працавалі б мы нармальна, як усе людзі. Дык не. Трэба сярод ночы падымацца, бо вы нешта абмяркоўваеце. Дня вам мала! І на выхадныя прыходзіцца працаваць, бо вы мітынгі ладзіце. Я ўжо не кажу пра час выбарчых кампаній. Тады трэба насіцца як дурны з торбай. А каму гэта трэба? Думаеце мне? Не-е! Сядзелі б па-хатах, нос не высоўваючы, і за вамі ніхто не сачыў бы. А то ўсё скардзіцеся, што вам жыць невыносна. Не вам, а нам кепска. Вось, прыкладам, сёння. Збіраўся я з сям'ёй у госці да лепшага сябра. Жонка задаволеная, дзеці цешацца. А тут званок. Даносчык тэлефануе. Два апазіцыянеры пайшлі ў бар пагаварыць. Вось і накрыліся мае госці.*

*Добра падпіты афіцэр злосна цяпнуў цэлую шклянку гарэлкі і так моцна стукнуў сябе кулаком у шырокія грудзі, што на суседніх століках мала не перавярнуліся талеркі.*

*— Я вам так скажу. Назіраем мы за вамі даўно. Людзі вы нармальныя. Нашмат лепшыя чым маё кіраўніцтва. Яно за мной цікуе больш, чым я за вамі. Невыносна стала жыць. Немажліва працаваць у такіх умовах, калі за табой сочаць. Благія яны, злыя. А самыя кепскія людзі гэта даносчыкі. Горшых гадаў, чым стукачы, я не ведаю. Шасцёрак стала нашмат болей, чым патрабуе наша праца. Тэлефануюць, даносяць... А мы на кожны піск стукача-дэбіла рэагаваць мусім. Вось каго трэба знішчаць — паганых шасцёрак. Шкада што мы без іх абысціся ніяк не можам.*

*Афіцэры расплаціліся за столік і сумна пасунуліся на выхад.*

*— Як ты думаеш, чаму яны нас пакінулі? — заліўшы вочы чарговай порцыяй, спытаўся Дзяніс.*

*— А што ім рабіць, як мы іх раскусілі, — задумаўся Юрась. — Хлопцы яны сапраўды добрыя, шчырыя. Ёсць, відаць, і ў КДБ нармальныя людзі. Але ж работа... Зараз хіба якога стукача, пра якога так кепска гаварылі, да нас падсадзяць.*

*Хлопцы разам перавялі позірк на ўваход. Адтуль, да іх століка, з радасным воклічам: „Прывітанне! Як я рады вас бачыць!”, накіроўваўся адзін з сяброў іх партыі.*

**Сымон Зладашмянскі**

# На загад

Васіль Петручук, член Саюза пісьменнікаў Польшчы і Беларусі, чытачам „Нівы” вядомы як наш даўні карэспандэнт. Гэты хлопец з вёскі Грабавец — чалавек вайсковай справы, ужо, вядома, у адстаўцы год да свайго юбілею васьмідзесяцігоддзя, не складвае рук, займаецца грамадскімі справамі, як і за ўсе свае гады нялёгкага жыцця — тут не хапіла б старонкі для пераліку ўсіх дзеяння гэтага актыўнага, поўнага жару чалавека, які, нягледзячы на сваё зруйнаванае інфарктамі сэрца, не пабаяўся стануць надосвітку насупраць распаленых помстай за вызваленне руйнавальнікаў помніка савецкім салдатам у Беластоку. І хоць яголыя грудзі на парадным строі-мундзіры ўвешаныя медалямі і ордэнамі, і хочацца яму пачуцця звычайнага мужчынскага гонару, на двары дзеці ведаюць яго як сівавалосага дзедку, які вельмі любіць дзяцей і ганарыцца сваімі дзецьмі і ўнучкамі, для якіх важныя ягоныя поспехі і звычайны шэры занятак пенсіянера ды тым больш змаганне за здароўе.

Васіль Петручук пісаў і піша. У сённяшні час, калі лёгка выдаюцца кнігі альбо „пад публічку”, альбо за вялікія грошы, да таго ўласным стараннем аўтара, які пры гэтым находзіцца ды напрасіцца нямала, замест займацца творчасцю, новыя кнігі Васіля Петручука спачываюць у шуфлядах. Нават і прапанаваць яму няма сілы. А,


11. Specjalność w zawodzie
12. Narodowość białoruska
13. Język macierzysty białoruski
14. Znajomość języków obcych polski rosyjski
4

вось, калі загад?.. Станавіся, ваяр, на месца і займайся справай! Гэтак і прыняў удзел „у конкурсе на загад”, і ягоныя ўспаміны апынуліся ў кнізе *Сляды**. Гэта кніга ўспамінаў прысланых на конкурс аб’яўлены з нагоды дзесяцігоддзя Саюза салдат Людовага польскага войска, выдадзеная ў 2004 годзе. Камісія, якую ўзначальваў старшыня Саюза польскіх пісьменнікаў, высока ацаніла ўспаміны маёра Васіля Петручука, які ім і даў загаловак: *Удзел у конкурсе на загад*, прысвоіўшы ім трэцяе месца. Калі ў жнівеньскім нумары 2002 г. „Голасу саратнікаў Людовай Арміі” прачытаў аб’яву аб конкурсе, нават і не пазнаёміўся з умовамі ўдзелу. Бо аб чым меў пісаць, калі як адзін з першых быў пазбаўлены ветэранскіх прывілеяў, як... вораг польскага народа? „Меў я хваліцца, як я да гэтага народа... прыдзіраўся, а нават яго... катаваў?!” Ды ў адзін лістападаўскі вечар пазваніў яму старшыня гуртка Саюза салдат ЛВП падпалкоўнік Мечыслаў Хадынецкі, паведаміў аб дадатковым тэрміне конкурсу і... даў загад прыняць у ім удзел!. Лаўрэат вельмі дасціпна распавядае аб тым, як „белыя валасы сталі дыба на галаве”, калі ўбачыў склад журы. Мабыць, дасціпнасць і лёгкасць пяра, якім апісвае прыгоды грабавецкага хлопца, які стаў жаўнерам, стала прычынай вылучэння твора з вялікай колькасці прысланых на конкурс успамінаў. Тэматыка яго зацікавіла, прызнаецца, як, мабыць, кожнага мужчыну, да таго „не мог выперціся таго, што хацеў быць героем, а не стаў ім, бо жыву і вегетую”.

„Апрача таго, што быццам я ішоў з гісторыяй Польшчы, ды басанож і абдзерты, вашывы і з пакалечаным нагамі, па бездарожжах, калі гісторыя маршыравала вертыкальна і свядома ў адпаведным напрамку. Абоім нам было кепска, але гісторыяй Польшчы хтосьці займаўся. А мною не пацікавіўся нават кульгавы Бурык, а нават і я, будучы падобным да яго, не выклікаў у ім інтарэсу”. Апісвае аўтар успамінаў моманты нам вядомыя з кнігі „Пожня”, пасля сваю дарогу ў народнае войска, шлях навукі і службы, і завяршае тэкст раздзелам „Айчына і я”. У ім Петручук шчыра пералічвае, што зрабіў як салдат. „Не ведаю, ці тым, што я апраўдаў словы паручніка даваеннага Польскага войска, які сказаў мне: „Kto w cywilu pasie krowy, w wojsku będzie chłop morowy” вырашыла мая амбіцыя, ці якія-сякія здольнасці, ці — можа — шчасце. Але я для Польскага Войска мог быць польскім камікадзе. І гэтага не выпіраюся і не саромлюся. Бо толькі народная ўлада спрычынілася да таго, што не стаў я жабраком ці кімсьці іншым на чужым ласкавым хлебе. Нікому чагосьці благога, служачы краіне, я не ўчыніў, а незалежна ад гэтага, адабралі ў мяне гонар саратніка і яго правы, а далі баёнскія сумы нейкай кампенсацыі тым, якіх я вышэй назваў какжушнікамі і злодзеямі свіней”.

Васіль Петручук захоўвае свае вайсковыя пасведчанні, дзе ён — беларус.

**Міра Лукша**

* *Ślady*, Warszawa 2004, ss. 156.

# *Свой хлеб*

*Яшчэ пару дзесяткаў гадоў таму амаль усе вясковыя гаспадыні самі пяклі хлеб. Сёння гэты від жыццёвай самадзейнасці знікае з вясковага побыту разам з усёй іншай спадчынай. Бо чаго таўчыся з дзяжою, бляхамі, жарам і попелам, калі пад самую хату прывязуць гатовы, да таго ж беленькі як у паноў, хлеб?*

*Надзея Шчэрбач з Хільмонаў-Калёніі ў свае маладыя гады марыла пра больш узнёслыя справы, чым выпяканне хлеба, які выпякала ейная мама. Але жыццёвыя дарогі непрадказальныя. Спадарыня Надзея выйшла замуж, нарадзіла крышку дзяцей. Крама была далёка, а хлеб быў неабходнай надзённычынай. Тут спытала, там спытала як рашчыняць і выпякаць і так сама праз сябе ўзялася за азы хлебапячэння. Спярша бульбу душыла да мукі, а як атрымала закваску, то ўжо і без бульбы стала абыходзіцца. Цяпер да заквасці дадае крыху дражджэй і жытнюю муку. Рана рашчыняе цеста, а на вечар пячэ.*

*— Пяку толькі ў бляхах, сем блях зараз — гэтага на тыдзень хапае. Скваркаю шмарую бляху, а пасля выпечкі шмарую скваркаю і сам хлеб, каб колер лепшы быў і скарынка мякчэйшая. Мая печ даўгавечная, калі я прыйшла ў Хільмоны замуж, то яна ўжо стаяла; напэўна будзе ёй за сорак гадоў.*


Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

*А распальваю печ дровамі, якія трапяцца. Пару разоў свайго хлеба не спякла і зрабіла бутэрброды з купным, то сямейнікі нават іх нюхаць не хацелі. Пяку і бабку, і кішку, і булкі. І торт, як трэба, зраблю, усё!*

*Надзея Шчэрбач пячэ хлеб на дажынкавыя мерапрыемствы з удзелам хільмонаўскага калектыву „Дваранкі”. А нядаўна спякла чатырнаццаць буханак для дырэкцыі Бебжанскага нацыянальнага парку, якая прымала ім замежных гасцей; дырэктар парку выпадкова пакаштаваў свойскі хлеб і вельмі прасіў, каб спячы яму для прыёму важных гасцей.*

***Аляксандр Вярбіцкі***

# *Цяжкі хлеб*

Цяпер лістаношам цяжка працаваць, пра што пераканаўся і я сам, адбубніўшы на пошце 37 гадоў. І тады не было лёгка, бо быў вызначаны план падпіскі газет ды і іншай бюракратыі не бракавала. З падпіскай я заўсёды спраўляўся выдатна, чаго доказам было па 200-250 гадавых падпісак „Нівы”. У апошніх гадах лістаношам дакінулі яшчэ продаж тавараў і пошукі спонсараў розных чэкавых узносаў ды іншыя абавязкі. І цешуся, што на канец вызваліўся я ад гэтай навалы працы, адыходзячы на заслужаную пенсію; не працую на пошце ўжо два з паловай гады.

Людзі пытаюць, ці не нудна мне па пошце. О, не, не нудна, хаця пошта часта сніцца па начах, напрыклад, што я развожу па вёсках цялят; гэта як у нейкай кашмарнай казцы. Цяпер лістаношам працы хапае па самыя вушы і няма ім калі займацца нават выпіскай газет, бо іншыя абавязкі з’явіліся ў іх працоўны графік. Пераважна працуюць яны па дамове: сёння праца, а заўтра — да пабачэння. Гэта яшчэ паўбяды, але горшае тое, што навалам ліквідуюцца паштовыя ўстановы, бо яшчэ нават пры мне былі паліквідаваны меншыя аддзяленні і нам дакідалі больш вёсак і абавязкаў; і неяк мы спраўляліся.

У планах прадбачваецца, што амаль усе паштамты па вёсках і меншых мястэчках будуць пазбаўлены сваіх лістаношаў, якія свой тавар будуць набіраць толькі ў Гайнаўцы, адтуль будуць яго развозіць па сваіх участках, разлічвацца яшчэ раз у Гайнаўцы і толькі пасля гэтага вяртацца дамоў. І падумаць, як гэта лістаношы з Кляшчэль ці Чаромхі будуць штодзень двойчы вандраваць сваімі самаходамі ў Гайнаўку і яшчэ забяспечваць паштовымі паслугамі свае ўчасткі. Гэта будуць касмічныя адлегласці і ім цяжка будзе спраўляцца з працоўнымі абавязкамі. Некаторыя можа і захочуць звольніцца з працы, але што далей? У іх жа сем’і, дзеці — і дзе пасля знайсці працу каб іх пракарміць? Гэта складаная справа і, як кажуць, нават на захадзе Еўропы, адкуль нашы паны бяруць прыклад, няма такога балагану і там лістаношы карыстаюцца павагай не толькі свайго насельніцтва, але і паштовага кіраўніцтва.

**Мікалай Панфілюк**

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

**Nakład**: 1 324 egz.
**Выдавец**: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва”.
**Старшыня**: Яўген Вапа.
**Адрас рэдакцыі**: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
**Тэл./факс**: (+48 85) 743 50 22.
**Internet**: *http://niva.iig.pl/*
**E-mail**: *redakcja@niva.iig.pl*

*Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.*
**Галоўны рэдактар**: Яўген Вапа.
**Намеснік гал. рэдактара**: Віталь Луба.
**Сакратар рэд.**: Аляксандр Максімюк.
**Рэдактар „Зоркі”**: Ганна Кандрацюк-Свярубская.
**Публіцысты**: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран-Асташэвіч.

**Канцылярыя**: Галіна Рамашка.
**Камп’ютэрны набор**: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
**Друкарня**: „Orthdruk”, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
**Prenumerata**: 1. Termin wpłat na prenumeratę na I kwartał 2006 r. upływa 5 grudnia 2005 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch” na terenie całego kraju.

2. Cena prenumeraty na IV kwartał 2005 r. wynosi 26,00 zł.

3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH” S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.

4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,50 zł, a kwartalnie — 45,50 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa”, Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta BPH PBK SA Oddział w Białymstoku 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.

# Мае імкненні

*Калі сядзіш дома, нічога ве ведаеш, што ў свеце творыцца. Кажаце, няпраўда? То ж можна ўключыць тэлевізар, і ўсенька ўбачыш — свежыя ньюсы адразу ў тую ж секунду, што падзея. І ўсё табе растлумачаць, калі ты вачам не верыш. Праўда, каментар не заўсёды сходны з тым што бачыш — бывае, што паказваюць пагінулых за адну справу, а каментатар кажа, што якраз наадварот, альбо не зусім героях назаве змагарамі... І мусіш бачыць свет вачыма быццам бы і аб'ектыўнай ды бесстаронняй тэлекамеры, але ўсё і так той свет інтэрпрэтаваны будзе іншымі назіральнікамі. А ты не мусіш быць зусім упэўнены, ці яны ведаюць больш за цябе, каб табе, простаму чалавеку, той свет патлумачыць. Але нішто яны, тыя каментатары, усе разам і кожны паасобку, у параўнанні з нашай бабай.*

*Адна баба другой бабе скажа адно, тая дадасць ад сябе нешта ў гэты аповед, бо ж моўная творчасць — адна з найбольш актыўнай разумовай і творчай дзейнасці чалавека, а баба — перш за ўсё чалавек, хоць бабы паміж сабою чалавекамі называюць сваіх мужыкоў. Народная творчасць — самая моцная і традыцыйная, і няма чаго мераца з ёю творчасці „прафесіяналаў". Я сам люблю паслухаць такое час ад часу. Такія „плёткі" — вельмі цікавая літаратура. Вядома, калі тыя „бабскія гісторыі" не кранаюць цябе самога.*

*Прысеў я на лавачку на прыпынку міжгародняга аўтобуса ў суседняй вёсцы; збіраўся ехаць у Беласток, пабыўшы на радзіме. А там адна цётачка ў хустцы аж заліваецца, расказвае пра аднаго асобеня.*

*— А вы ведаеце, што ў яго ўжо будзе чацвёртая жонка? Трэцюю, Кацьку, абдзёр з усяго, разводзячыся. Шкада, што дзяцей не мелі, бо хоць аліментамі яго прыдушыла б. Гад, якога свет не бачыў! Хату, праўда, пакінуў, ды ў яго аж тры, не лічыўшы вілы ў вёсцы.*

*— А там, вілы, вілы то можа ён мае пад хлявом! — зажартаваў я.*

*— А вы яго не ведаеце, таго Лукаша Праведсуда! Называецца „Праваеуд", а варта пад суд яго падаць! Бярэ „рэнты" ройна тысячу пяцьсот, пайшоў на пенсію быццам бы па прычыне здароўя, а робіць яшчэ на дзвюх пасадах. Здаровы ён, як каніска! Няма на яго ніякае ўправы...*

*Іншыя бабулькі замахалі рукамі перад расказчыцай, даючы сігналы, што герой плёткі сядзіць побач, замігалі вачыма, а тая працягвае далей:*

*— Во, мае „мерседэса", а купіў нядаўна чырвонага „форда". Нашто яму столькі машын!*

*А што ж гэта такое, я ж, адкуль пазбыўся заезджанай „сірэнкі", не маю ніякага аўто. Ровар, праўда, купіў нядаўна, і нават не нейкую „ўкраіну" (не буду называць тут фірму, бо не робім у „Ніве" бясплатнай рэкламы)!*

*— Аддаў бы хоць той „мерседэс" трэцяй жонцы... А то голую пакінуў... Беспрацоўная... Добрая я ведаю такіх!..*

*Якая трэцяя жонка, а і чацвёртая ў планах, калі ўсё жыццё жыву са сваёй Маняй, а тая яшчэ на паўштату робіць на пошце...*

*— А, калі вы так аба мне, як аб добра вядомым сабе чалавеку гаворыце, дык я, Лукаш Праведсуд, аддам той свой „мерседэс". Альбо і той чырвоны „форд". Бярыце ключыкі! — і я кінуў на калені анямелай пляткарцы ключыкі. Ад свіронка.*

Лукаш ПРАВАСУД



Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

# Доказ Саламонавай мудрасці

На здымку адна са сцен павеці на аўтобусным прыпынку ў Дубасне, што на Дуброўшчыне. Відаць на ёй вітражную выяву крыжа. Відаць таксама, можа на здымку не так добра як у наяўнасці, некаторыя пабітыя або патрэсканыя белыя люксферы навокал крыжа, некаторыя з іх непасрэдна прымыкаюць да выявы. Затое ўсе аранжавыя шкляніны выявы — цэлыя. Можна сабе пра гэта падумаць як пра нейкі цуд. Што нейкая нячыстая сіла хацела парушыць сімвал святасці, але ён аказаўся недатыкальным нячыстаму духу, адно толькі навакольнае шкло крыху пацярпела ад атакі злых моцаў. Мабыць, аднак, тыя злыя моцы не былі з іншага свету, толькі з не надта далёкага наваколля. І, мабыць, яны з таго гатунку, які Бог стварыў у шосты дзень; на падабенства. А пасля, на працягу ўсялякай гісторыі, калі людзям прыбывала ўсё больш часу, яны замест таго падабенства ўсё больш сталі назіраць і ўсведамляць прысутнасць чарцей у сваім побыце. У наш багаты часам час ужо ў шмат каго чэрці сядзяць. І тыя жулікі, якіх чорт падбіў пакрысе разбіць прыпынак, пабаяліся, відаць, як чорт крыжа, крануць аранжавыя шкляніны. Мудры цар Саламон ужо даўно заўважыў, што страх Божы адводзіць ад зла (Пр., 16:6). **(ав)**



# Адгаданка

1. раённы цэнтр на рацэ Арэсе, 2. пасля суботы, 3. псеўданім Уладзіміра Ульянава, 4. зорная пара сутак, 5. адчуванне фізічнай пакуты, напр. у выніку траўмы, 6. афіцэрскае званне камандзіра судна, 7. паўзун са звілістым целам і ядавітымі зубамі. **(ш)**

Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне — фразеалагізм.

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

**Адказ на адгаданку з 34 нумара**

Адзежа, настаўніца, смоўж, якут, хобі, піўная, бінт, галава, Троя. Рашэнне: **Кожная хата ў жніўні багата.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Міхалу Байко** з Беластока і **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў.

Praktyczna Nauka Języków
www.master.szkola.pl
MASTER
Białystok, ul. Nowy Świat 2
tel. 744-5-744
angielski hiszpański włoski francuski niemiecki
kupon ważny do 8 października 2005
kursy dla dzieci
6% dodatkowej zniżki
dla nowych słuchaczy przy zapisach na wszystkie kursy
MATURA z egzaminatorem
Studencki zjazd cenowy!
Konwersacje z natywem dla słuchaczy szkoły – bezpłatne

# 02.10 – 09.10



**Баран (20.03. — 19.04.)** Не ацэньвай іншых занадта сурова. І ты — не беспамылковы. Апрача ўласнага ўкладу працы лічыцца таксама гарманічнае супрацоўніцтва з іншымі. З партнёрам вяшчаеце крыху на іншых хвалях.

**Бык (20.04. — 20.05.)** Будзеш эксперыментаваць у спальні. Ахвота паводзіць сябе супраць нормаў і звычаяў атачэння; можаш зрабіць вялікую памылку. Асцярожна ангажуйся ў новыя сувязі; можаш вялікія пачуцці накіраваць на неадпаведную асобу.

**Блізняты (21.05. — 21.06.)** Праца ў калектыве — гэта табе трэба! Адзін мала падзейнічаеш. Будзь цярплівы і дакладны. Дбай аб тое, каб паміж табою і партнёрам не было недаказанага, скрываных жаляў ці прэтэнзій.

**Рак (22.06. — 22.07.)** Сэрца цягне да кагосьці? Не бойся, зрабі першы крок; варта! Гарантаваны поспех, калі за справу возьмешся з сям'ёй ці сябрамі. Уласныя мэты дасягнеш мірна і дыпламатычна.

**Леў (23.07. — 22.08.)** Афармляй усё, што патрабуе дакладнасці, тактычнасці. Добры ўплыў зорак на партнёрства і мастацкія дзеянні, таксама ў гандлі, псіхалогіі, законе, асвеце, пасрэдніцтве. Насі чырвоны колер, дадасць табе рашучасці.

**Дзева (23.08. — 22.09.)** Твая ўпартасць можа навесці на цябе і партнёра страты ці прыкрасці. Калі табе на чымсьці залежыць, выкрасаеш з сябе агрaмадную энергію. Асцерагайся нятрапных фінансавых рашэнняў. Пільнуй здароўя.

**Шалі (23.09. — 22.10.)** Аптымізм, неблагое здароўе і агульны жыццёвы поспех. Жарсці і пачуцці могуць узяць верх над здаровым розумам. Не купляй дарагіх рэчаў для сябе і дому, каб пасля не плявацца на свой густ.

**Скарпіён (23.10. — 21.11.)** Будзеш надта згодны, схільны да ўступак і аддання. Энергія накіраваная больш на працу і абавязкі, але знайдзі час на прыемнасці. Захочацца набыць тэхніку для гаспадаркі ці паправы стану здароўя.

**Стралец (22.11. — 21.12.)** Не ўлазь у інтрыгі, не змаўляйся; гэта ж не ў тваім стылі! Тыдзень „у клетку". Добрыя адносіны з людзьмі, але ж жыццё не ўсланае ружамі. Спрашчай праблемы, на ўсё глядзі з дыстанцыі.

**Казярог (22.12. — 19.01.)** Ці цяпер мусіш быць шчыры аж да болю? Хоць раз раскажы намёкамі аб непрыемных справах. У жыцці, апрача працавітасці і сумленнасці, прыдаецца таксама тактычнасць і дыпламатычнасць.

**Вадалей (20.01. — 18.02.)** На дарозе тваёй кар'еры гарыць зялёнае святло. Лёс табе спрыяе! Партнёрству нічога не пагражае, але можа не ўдацца пазбегчы дробных канфліктаў і непаразуменняў.

**Рыбы (19.02. — 19.03.)** Не вырашай важных фінансавых спраў (пагражаюць страты). Сваркі і непаразуменні дома, зайздрасць. Бярыцеся за працу, пільнуйце абавязкаў, зважайце на памылкі, бо вас скрупулёзна з гэтага разлічаць.

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960